Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 6 1933 г. № 51 (4595) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АДОЗВА ВЫКАНКОМУ КАМІНТЭРНУ да рабочых усіх краін (1 стар.).
Аб рабоце Наркамзему і Трактарацэнтру БССР — Пастанова Бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б (3 стар.).
УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ (1 стар.).
Ліст сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО і старшыні СНК БССР т. ГАЛАДЗЕДА ў рэдакцыю «Праўды» (2 стар.).
А. ДЖЭЛЮК, А. ІОФЭ — Як «Віцебскі пралетары» «зрывае маскі» (2 стар.).
Вопыт заводу — калгасам (3 стар.).
АБ ХОДЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ — Пастанова ЦК КП(б)Б (3 стар.).
ЗА МЯЖОЙ
Забарона апублікаваньня вынікаў выбараў у рэйхстаг (1 стар.).
Паліцэйскі налёт на кватэру германскага карэспандэнта «Праўды». (1 стар.).

Адзіным пралетарскім фронтам на барацьбу супроць фашысцкай рэакцыі

За адзіны баявы фронт пралетарыяту

Да рабочых усіх краін!

АДОЗВА ВЫКАНКОМУ КАМІНТЭРНУ

ПАРЫЖ, 5. (ТАСС). У «ЮМАНІТЭ» сёньня надрукавана адозва Выканкому Камінтэрну «ДА РАБОЧЫХ УСІХ КРАІН» па пытаньні аб адзіным фронце. У адозьве гаворыцца:

«Крызіс усё разгортваецца і паглыбляецца. Беспрацоўе бязупынна расьце. Голад і галеча ахапляюць усё новыя і новыя пласты рабочых. Наступленьне капіталу абвастраецца. Буржуазія ідзе паходам на ўсе палітычныя і эканамічныя заваяваньні рабочай клясы. Фашысцкая рэакцыя ахапляе адну краіну за другой. Устанаўленьне адкрытай фашысцкай дыктатуры ў Германіі, паставіла перад мільёнамі рабочых усіх краін ва ўпор пытаньне аб неабходнасьці арганізацыі адзінага фронту барацьбы супроць фашысцкага наступленьня буржуазіі і, перш за ўсё, германскай буржуазіі, якая крок за крокам адбірае ўсе эканамічныя і палітычныя заваяваньні рабочае клясы і мэтадамі бязьлітаснага тэрору прабуе задушыць рабочы рух.

Галоўнай перашкодай на шляху стварэньня адзінага фронту барацьбы камуністычных і сацыял-дэмакратычных рабочых была і ёсьць палітыка супрацоўніцтва з буржуазіяй, праводзімая сацыял-дэмакратычнымі партыямі, якія паставілі цяпер міжнародны пралетарыят пад удар клясавага ворага. Гэтая палітыка супрацоўніцтва з буржуазіяй, вядомая пад імем так званай палітыкі «меншага зла», прывяла на справе ў Германіі да перамогі фашысцкай рэакцыі.

Камуністычны Інтэрнацыянал і кампартыі ўсіх краін ня раз заяўлялі аб сваёй гатоўнасьці да супольнай барацьбы з сацыял-дэмакратычнымі рабочымі супроць наступленьня капіталу, палітычнай рэакцыі і пагрозы вайны. Камуністычныя партыі былі арганізатарамі супольнай барацьбы камуністычных, сацыял-дэмакратычных і беспартыйных рабочых, наперакор правадыром сацыял-дэмакратычных партый, якія сыстэматычна зрывалі адзіны фронт рабочых мас. Яшчэ 20 лістапада мінулага году германская кампартыя пасьля разгрому прускага сацыял-дэмакратычнага ўраду фон-Папэнам зьвярнулася да сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі і ўсегерманскага аб'яднаньня прафсаюзаў з прапановай аб арганізацыі супольнай забастоўкі супроць фашызму. Але сацыял-дэмакратычная партыя Германіі і ўсегерманскае аб'яднаньне прафсаюзаў пры ўхваленьні ўсяго II-га Інтэрнацыяналу кваліфікавалі прапанову аб арганізацыі супольнай забастоўкі як правакацыю. Сваю прапанову аб супольных дзеяньнях камуністычная партыя Германіі аднавіла ў момант прыходу да ўлады Гітлера, заклікаючы ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі і праўленьне ўсегерманскага аб'яднаньня прафсаюзаў супольна арганізаваць адпор фашызму, але і на гэты раз яна атрымала адмову. Больш таго, калі ў лістападзе мінулага году бэрлінскія транспартнікі аднадушна забаставалі супроць зьніжэньня заработнай платы, сацыял-дэмакратыя сарвала адзіны фронт барацьбы. Падобнага роду прыклады напаўняюць практыку міжнароднага рабочага руху.

Між тым, у адозьве Бюро Сацыялістычнага Рабочага Інтэрнацыяналу ад 19 лютага г. г. апублікавана заява аб гатоўнасьці сацыял-дэмакратычных партый, якія ўваходзяць у гэты Інтэрнацыянал, устанавіць адзіны фронт супольна з камуністамі для барацьбы супроць фашысцкай рэакцыі ў Германіі.

Гэта заява знаходзіцца ў рэзкай супярэчнасьці з усімі дзеяньнямі Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу і сацыял-дэмакратычных партый да гэтага часу. Уся палітыка і дзейнасьць Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу да гэтага часу дае падставу Камінтэрну і камуністычным партыям ня верыць у шчырасьць заявы Бюро Сацыялістычнага Рабочага Інтэрнацыяналу, які выступае з гэтай пастановай у той момант, калі ў цэлым радзе краін і перш за ўсё ў Германіі, сама рабочая маса ўжо бярэ арганізацыю адзінага фронту барацьбы ў свае рукі.

Тым ня менш перад тварам фашызму, які наступае на рабочую клясу ў Германіі і разьвязвае ўсе сілы сусьветнай рэакцыі, Выканком Камінтэрну заклікае ўсе камуністычныя партыі зрабіць яшчэ адну спробу ўстанаўленьня адзінага фронту сумесна з сацыял-дэмакратычнымі рабочымі масамі пры дапамозе сацыял-дэмакратычных партый. Выканком Камінтэрну робіць гэту спробу ў цьвёрдай упэўненасьці, што адзіны фронт рабочае клясы супроць буржуазіі адбіў-бы наступленьне капіталу і фашызму і надзвычай паскорыў-бы няміноўчы канец усякай капіталістычнай эксплёатацыі.

У сілу своеасаблівасьці ўмоў паасобных краін і рознасьці канкрэтных задач барацьбы, якія паўстаюць перад рабочай клясай у кожнай з іх, згоды паміж кампартыямі і сацыял-дэмакратычнымі партыямі — для пэўных дзеяньняў супроць буржуазіі — могуць быць з большым посьпехам праведзены ў рамках паасобных краін. Таму Выканком Камінтэрну раіць кампартыям выступіць з прапановамі да адпаведных цэнтральных камітэтаў сацыял-дэмакратычных партый, якія ўваходзяць у Сацыялістычны Інтэрнацыянал, аб супольных дзеяньнях супроць фашызму і наступленьня капіталу. У аснову такіх перагавораў павінны быць пакладзены элемэнтарныя ўмовы сумеснай барацьбы супроць наступленьня капіталу і фашызму. Без канкрэтнай праграмы дзеяньняў супроць буржуазіі ўсякая згода паміж партыямі была-б накіравана супроць інтарэсаў рабочай клясы. Выканаўчы Камітэт Камуністычнага Інтэрнацыяналу таму прапануе пакласьці ў аснову такіх згод наступныя ўмовы для супольных дзеяньняў:

а) Камуністы і сацыял-дэмакраты неадкладна прыступаюць да арганізацыі праведзеньня адпору атакам фашызму і рэакцыі на палітычныя, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і інш. арганізацыі рабочых, на рабочы друк, на свабоду сходаў, дэманстрацый і стачак; яны арганізуюць сумесны адпор узброеным нападам фашысцкіх банд шляхам праведзеньня масавых пратэстаў, вулічных дэманстрацый, масавых палітычных стачак; яны прыступаюць да арганізацыі камітэтаў дзеяньня на прадпрыемствах, біржах працы і ў рабочых кварталах, а таксама і да арганізацыі атрадаў самаабароны.

б) Камуністы і сацыял-дэмакраты неадкладна прыступаюць да арганізацыі пратэсту рабочых пры дапамозе мітынгаў, дэманстрацый і забастовак супроць усякага зьніжэньня зарплаты, супроць пагоршаньня ўмоў працы, супроць пасяганьня на сацыяльнае страхаваньне, супроць урэзкі дапамог беспрацоўным, супроць звальненьняў з прадпрыемстваў.

в) Пры прыняцьці і практычным правядзеньні ў жыцьцё гэтых дзьвёх умоў Выканком Камінтэрну лічыць магчымым раіць камуністычным партыям адмовіцца ад нападкаў на сацыял-дэмакратычныя арганізацыі на час супольнай барацьбы супроць наступленьня капіталу і фашызму. Супроць усіх, хто парушыць умовы згоды ў справе правядзеньня адзінага фронту, павінна весьціся самая бязьлітасная барацьба, як супроць штрэйкбрэхераў, якія зрываюць адзіны фронт рабочай клясы.

Гэтыя ўмовы, якія маюць на ўвазе партыі, што ўваходзяць у склад Сацыялістычнага Рабочага Інтэрнацыяналу, адносяцца таксама і да тых партый, як, напрыклад, ангельская незалежная рабочая партыя, якія зьвярнуліся да Камуністычнага Інтэрнацыяналу з прапановай аб арганізацыі адзінага фронту барацьбы.

Перад усёй міжнароднай рабочай клясай Выканком Камуністычнага Інтэрнацыяналу робіць гэтыя прапановы і заклікае ўсе камуністычныя партыі і, у першую чаргу, камуністычную партыю Германіі, не чакаючы рэзультатаў перагавораў і згод аб супольнай барацьбе з сацыял-дэмакратыяй, неадкладна прыступіць да арганізацыі сумесных камітэтаў барацьбы як з сацыял-дэмакратычнымі рабочымі, так і з рабочымі ўсіх іншых напрамкаў.

Камуністы даказалі сваёй шматгадовай барацьбой, што яны былі і заўсёды будуць у першых радах барацьбы за адзіны фронт не на словах, а на справе, у клясавых дзеяньнях супроць буржуазіі.

Выканаўчы Камітэт Камуністычнага Інтэрнацыяналу цьвёрда перакананы, што сацыял-дэмакратычныя і беспартыйныя рабочыя незалежна ад таго, як правадыры сацыял-дэмакратыі адносяцца да стварэньня адзінага фронту, — пераможуць усе перашкоды і супольна з камуністамі ажыцьцёвяць адзіны фронт не на словах, а на справе.

Іменна цяпер, калі германскі фашызм арганізаваў у мэтах разгрому рабочага руху ў Германіі нячуваную правакацыю (падпал рэйхстагу, фальшывыя дакуманты аб паўстаньні і інш.) кожны рабочы павінен зразумець свой клясавы абавязак у барацьбе супроць наступленьня капіталу і фашысцкай рэакцыі.

ДАЛОЎ ФАШЫСЦКУЮ РЭАКЦЫЮ І ТЭРОР СУПРОЦЬ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ!

ЗА АДЗІНЫ БАЯВЫ ФРОНТ ПРАЛЕТАРЫЯТУ!

ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЯ КАПІТАЛУ І ФАШЫЗМУ!»

Забарона апублікаваньня вынікаў выбараў у рэйхстаг

БЭРЛІН, 4. Агенцтва «Вольфа» паведамляе з **Саарбрукену** (Саарская вобласьць), што ўрадавая камісія **Саарскай** вобласьці выдала распараджэньне, забараняючае склікаць сходаў і дэманстрацый 4 і 5 сакавіка. Камісія забараніла для «захаваньня спакою і бясьпечнасьці» перадачу вынікаў выбараў у германскі рэйхстаг на плацах і вуліцах.

Паліцэйскі налёт на кватэру бэрлінскага карэспандэнта „Праўды“

БЭРЛІН, 4. Сёньня днём у кватэру карэспандэнта «Праўды» **ГАРТМАНА** зьявіліся два паліцэйскія з двума агентамі палітычнай паліцыі ў штацкім і зрабілі вобыск.

Вобыск ня даў ніякіх вынікаў. Паліцыя нічога не ўзяла з сабой. Тав. **ЧАРНЯК**, які прыбыў учора з Масквы для работы ў якасьці карэспандэнта «Праўды» і знаходзіўся ў гэты час на кватэры, быў арыштован і адведзен у паліцэйскі вучастак, адкуль быў выпушчаны праз гадзіну, пасьля адпаведнага прадстаўленьня савецкага паўпрэдзтва. У т. **ЧАРНЯКА** ў вучастку быў зроблен асабісты вобыск пад прадлогам «пошукаў зброі».

Скапленьне гітлераўцаў на польскай граніцы

Гэта запальваньне запалак у парахавым пограбе

ВАРШАВА, 4. Польскі друк увесь час зьмяшчае вельмі трывожныя артыкулы і тэлеграмы аб падзеях у Германіі. Паведамленьне, што ўночы з 4 на 5 сакавіка германскія фашысты мяркуюць распаліць вялізарныя вогнішчы блізка ля граніцы ў **Верхняй Сілезіі і ва Ўсходняй Прусіі** для таго, каб «напомніць закардонным немцам аб абуджанай да жыцьця Вялікай Германіі», выклікае незадаволенасьць. Газэты перадрукоўваюць артыкул з «Ньюс кронікль», у якім гаворыцца: «**Гітлер** пакуль пераймае мэтады свайго італьянскага папярэдніка і пакуль захоўвае спакой у адносінах заграніцы. Ня трэба, аднак, захапляцца і забываць аб небясьпецы, якая ўзьнікае, калі гітлераўцы масамі стануць скапляцца блізка ля польскай граніцы і будуць гаварыць падбухторваючыя прамовы аб калідоры. Гэта будзе магчыма толькі гэстам, аднак, гэст гэты падобны запальваньню запалак у парахавым пограбе.

Афіцыёз «**Газэта польска**» друкуе тэлеграму з **Кёнігсбэргу** аб падрыхтоўцы да прамовы **Гітлера**, якая вядзецца ва **Ўсходняй Прусіі**. У сваёй прамове Гітлер будзе быццам патрабаваць звароту калідору Германіі.

Блізкі да ўраду «**Кур'ер паранны**» зьмясьціў учора характэрны артыкул, у якім між іншым піша: «Увесь сьвет трапеча ў цісках падвойнага крызісу—эканамічнага і ідэалёгічнага. Магутны ангельскі фунт зваліўся з залатога стандарту.

Францыя траціць прытомнасьць перад тварам грознага прарыву ў бюджэце і катастрофы, якая набліжаецца. Адыходзячага Гувэра праводзяць крыкі абурэньня ўласьнікаў зьберажэньняў, якія штурмуюць касы 20 тыс. банкаў. А што адбываецца тут-жа блізка ад нас за пагранічнай мяжой у Германіі—якое гіганцкае напалёнае сустракаваньне сіл».

Газэта паказвае на небясьпеку ўзмацненьня ў Германіі імкненьняў да рэваншу і лічыць, што абстаноўка дыктуе «салідарныя намаганьні ўсяму польскаму народу».

Далейшае наступленьне японскіх войск у Жэхэ

Перадавы японскі атрад заняў Чэндэ

ШАНХАЙ, 4. Паведамленьні з **Бэйпіну** канчаткова пацьвярджаюць здачу **Чэндэ** (сталіца правінцыі Жэхэ) кітайскімі войскамі. Горад заняты перадавым японскім атрадам у 128 чал. **Тан Юй-лін** выехаў у невядомым напрамку, па некаторых вестках на поўнач. Лічаць магчымым пераход **Тан Юй-ліна** на бок японцаў. **Чжан Сюэ-лян** аддаў загад аб арышце **Тан Юй-ліна**.

Шлях ад **Чэндэ** да **Губэйкоу** заняў неп адыходзячымі кітайскімі войскамі. Па загаду **Чжан Сюэ-ляна**, усякі адступаючы за вялікую сьцяну павінен быць расстрэлен. **Чжан Сюэ-лян** сканцэнтраваў для гэтай мэты 20.000 войск у праходзе **Губэйкоу**. Ва ўсіх эвакуяваных з **Жэхэ** будзе рабіцца вобыск і без прапуску яны ня будуць прапушчаны далей.

Лёс кітайскіх войск, не пасьпеўшых эвакуявацца, невядомы. Паводле афіцыяльных кітайскіх паведамленьняў, яны змагаюцца далей з японцамі ў раёне **Ліньюаню і Пінць-юаня**. Паводле японскіх вестак, яны таксама пайшлі на поўдзень, прабуючы прайсьці праз праходы Ўсходняй Губэйкоу. Строгія меры **Чжан Сюэ-ляна** выкліканы небясьпекай, што гэтыя войскі могуць парушыць «спакой» у Паўночным Кітаі. Ва ўсіх афіцыяльных кітайскіх паведамленьнях з **Бэйпіну** наглядаецца тэндэнцыя зваліць усю віну за паражэньне на **Тан Юй-ліна** і кітайскія валанцёрскія часьці.

**

ТОКІЁ, 4. Паводле паведамленьня агенцтва «Сімбун Рэнго», з Шанхай-Гуаню атрыманы весткі аб тым, што сёньня кітайскія часьці пачалі ўсеагульнае адступленьне з **Жэхэ** па тэрыторыю **Паўночнага Кітаю** праз праходы вялікай сьцяны—Сыфэнкоу і Дзілінкоу.

Паўднёвы Кітай супроць Нанкіну

ТОКІЁ, 4. «Сімбун Рэнго», спасылаючыся на весткі японскага ваеннага міністэрства, указвае, што ў Паўднёвым **Кітаі** ўзмацніўся рух за незалежнасьць яго ад нанкінскага ўраду. Рух узначальваецца **Чэн Цзітанам** (камандуючы гуаньдунскімі войскамі) і **Ху Хан-мінем**, якія правялі 27 лютага нараду прадстаўнікоў правінцый Хунань, Сітуань, Юнань, Гуйджоу і Гуаньдунь, абмеркаваўшы пытаньне аб стварэньні ўраду Паўднёвага Кітаю. Паводле вестак ваеннага міністэрства, група гомыньдану гатова далучыцца да гэтага руху.

Узмацненьне антыяпонскага байкоту ў Кітаі

ШАНХАЙ, 4. Як падаюць гонкангскія газэты, **антыяпонскі байкот у Кітаі ўзмацняецца.** Горад падзелен на вучасткі, у кожным з якіх дзейнічае атрад таварыства «нацыянальнага выратаваньня», робячы вобыскі ў складах і крамах і канфіскуючы японскія тавары. У байкоце прымае актыўны ўдзел новая карэйская арганізацыя пад назвай «Кітайска-карэйская асацыяцыя».

Банкавы крах у ПАЗШ

Н'Ю-ЁРК, 4. Абвешчана аб спыненьні аперацый усіх банкаў у штатах **Н'ю-Ёрк і Ільлінойс**, якія зьяўляюцца фінансавымі цэнтрамі злучаных штатаў. Чакаюць закрыцьця рэшты банкаў па ўсёй краіне, а таксама закрыцьця **Н'ю-Ёрскай** біржы і збожжавай біржы ў **Чыкага.** Банкаўскі мараторы ў штаце Н'ю-Ёрк абвешчан да 6 сакавіка ўключна, а ў штаце Ільлінойс да 7 сакавіка.

ТРАКТАРНЫ ПАРК—У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ!

Менская МТМ выпускае дрэнна адрамантаваныя трактары

Шкоднік Янушкевіч кіруе зборачнай брыгадай

Менская машына-трактарная майстэрня павінна адрамантаваць 229 трактараў, матораў і розных дэталяй. Аднак, дагэтуль ня ўсе трактары і маторы, якія патрабуюць рамонту, прысланы саўгасамі і МТС. Да 28 лютага прыбылі 194 трактары і маторы і 52 каленчатых валы.

Ужо адрамантавана 110 адзінак, што складае толькі **56 проц.** пляну.

Да апошняга тэрміну рамонту засталося 15 дзён. За гэты адрэзак часу трэба выпусьціць 20 трактараў, 4 аўтамашыны, 8 каленчатых валаў і 59 матораў.

З 7 брыгад, якія працуюць па рамонце, толькі 2 — брыгады **Арцімовіча і Плашчынскага**—выконваюць заданьні. Іншыя пяць брыгад праграму сыстэматычна ня выконваюць.

Ня гледзячы на тое, што партарганізацыя вынесла рад пастаноў аб давядзеньні да брыгад сутачных заданьняў, тэхнічны дырэктар **Герасімовіч** адмаўляецца даваць сутачныя заданьні брыгадам.

Асабліва дрэнна працуюць брыгады **Янушкевіча, Грамыка, Папіскула.** У гэтых брыгадах людзі не расстаўлены, ніякай працоўнай дысцыпліны няма, рабочыя пакідаюць майстэрні на гадзіну раней гудка. У часе работы брыгадзір Грамыка і рабочыя з яго брыгады грэюцца ля печы.

Янушкевіч праводзіць дэзарганізатарскую, шкодніцкую работу ў майстэрні. Нядаўна ён падышоў да брыгады Бондарава і заявіў: «навошта стараецеся, усё роўна расцэнак не павысяць».

Якасьць рамонту вельмі дрэнная. Адрамантаваны для саўгасу «Вішнёўка» трактар праз 6 дзён прыпыніў у прыгоднасьць. Няма тэхнічнага нагляду за якасьцю рамонту. Нядаўна Янушкевіч вывез з майстэрні адрамантаваны трактар, які стаяў на прамыўцы. Вада ў радыятары замерзла, трактар папсаваўся.

Майстэрня не забясьпечана кадрамі. Паводле разьвёрсткі Наркампрацы, заводы БССР павінны даць майстэрні 6 брыгадзіраў (двух — завод «Ударнік», двух — «Чырвоны металіст», двух — аўтатэхнікум). Разьвёрстка засталася на паперы.

Вялікую ролю ў рабоце майстэрні адыгрывала насьценгазэта «**За здаровы трактар**». Аднак, за апошні час газэта ня выходзіць. Члены рэдкалегіі **Балдоўскі і Васілеўская** тыднямі марынуюць матар'ял у кішэнях.

Усе гэтыя факты гавораць аб непадрыхтаванасьці Менскай МТМ да веснавой сяўбы, аб злачынных адносінах да рамонту трактарнага парку.

Я. ГАРОШКА.

Затрымліваюць прысылку дэталяй

ВІЦЕБСК. У парадку вытворча-тэхнічнага шэфства над Гарадоцкай МТМ завод «**Чырвоны металіст**» узяў на сябе абавязак вырабіць для МТМ 1.800 шатунных балтоў з гайкамі, перапрацаваць 1.000 шатунных пальцаў, адліць 145 чыгунных балванак да поршневых пальцаў. Гэта — тэрміновы заказ, ад выкананьня якога залежыць пасыпяховы рамонт трактараў.

Ня гледзячы на тэрміновасьць заказу, амаль ні адна дэталь заводам ня зроблена. Віну за гэта нясе Гарадоцкая МТМ. Шатунныя пальцы прысланы заводу толькі 13 лютага і то замест 1.000 штук — 346, а разьмеры іх пасьля неаднаразовых патрабаваньняў заводу атрыманы толькі 15 лютага. Чарвячныя валы не атрыманы дагэтуль.

Завод «**Камінтэрн**» шэфствуе над Лепельскай МТС. Паводле заключанага паміж імі дагавору, завод павінен вырабіць 600 штук поршневых пальцаў, 130 балтоў з гайкамі, 30 сацыялітавых чашак. Заказ дагэтуль ня выканан. Гэта — рэзультат няўмелага скарыстаньня машын і варштатаў. З 20 варштатаў токарнага цэху толькі 5 працуюць па заказы для МТС. Чашкі абточваюцца на адным токарным варштаце. Гэта значыць, што заказ, напэўна, нават на палову ня будзе выканан да тэрміну.

Лепш стаіць справа ў ліцейным цэху (загадчык т. **Лажэчца**), дзе адліўка чашак і балванак выканана на 3 дні раней тэрміну. Тэрміновых заказаў для Віцебскай МТС яшчэ не пачалі выконваць. На заводзе лічаць, што заказ Віцебскай МТС — «дробязь»; сама МТС — пачакае.

А. Зарубежны.
Д. Пецярэнка.

Занесены на чорную дошку

за зрыў пляну рамонту трактараў наступныя МТС:

Па сыстэме Ільнатрактарацэнтру

Бешанковіцкая МТС — дырэктар Агееў.
Крупская — Бобрык.
Горацкая — Данілаў.
Гарадоцкая — Нікіфараў.
Суражская — Кавалёў.
Мсьціслаўская — Шведзік.
Чавуская — Рабіс.
Шклоўская — Зелянкоўскі.

Па Бульбатрактарацэнтру

Гомельская МТС — Байдакоў.
Жлобінская — Рагаў.

Па Збожжатрактарацэнтру

Хойніцкая МТС — дырэктар Лаўрыновіч.
Пухавіцкая — Шаблоў.

Наступныя МТМ, якія зрываюць пляны рамонту трактараў і матораў

1. Гарадоцкая — дырэктар **Лялюга.** 2. Горацкая — **Лімашонак.**

Па трактарах

1. Гомельская — дырэктар Балевіч. 2. Слуцкая — Навумовіч.

Па маторах

1. Аршанская — дырэктар Штэйер. 2. Клімавіцкая — Рунгаеп.
3. Рагачоўская — Ланковіч.

НІЗКАЯ ЯКАСЬЦЬ РАМОНТУ—БІЧ ГОМЕЛЬСКАЙ МТМ

ГОМЕЛЬ. (Наш спэцкар.). «Зьвязда» ўжо давала разгорнуты паказ прычын зрыву рамонту па Гомельскай МТМ.

Зьмена кіраўніцтва, перакідка ў майстэрню групы кваліфікаваных рабочых заводу імя Ланцуцкага і рад іншых мер павінны былі аздаравіць становішча майстэрні. На справе-ж пералом не дасягнут. Сутачны плян — **адрамантаваць 5 трактараў** — вось ужо больш дэкады ня выконваецца. У пачатку былі ўважлівыя прычыны — не хапала каленчатых валаў. Аршанская МТМ затрымала прысылку валаў. Да 23-га лютага валы двесьці вандравалі па чыгунцы. Але і пасьля атрыманьня валаў Гомельская МТМ пляну ня выконвае.

Дзе прычыны гэтага? Прычына раней за ўсё ў «галавакружэньні» ад посьпехаў у новага кіраўніцтва. Бачыце, ранейшае кіраўніцтва ня выпусьціла за ўвесь час ні аднаго трактара, а зараз бываюць дні, калі па чатыры трактары выходзяць з рамонту. Гэты самаспакой не абяцае нічога добрага. Да 10-га сакавіка павінна быць выпушчана 119 трактараў. Дагэтуль адрамантавана толькі каля 40, замест 22 трактарных плугоў выпушчана толькі 4.

Якасьць — самае слабае зьвяно ў рабоце МТМ. **Паўторнасьць рамонту дасягае 50 проц.** Па віне механіка **Місякова** і брыгадзіраў **Ясінскага, Сьмітрыцкага і Міткевіча** прыйшлося на працягу 3-х дзён паўторна разьбіраць сабраныя 5 трактараў, бо ў іх аказаліся расхістаныя каленчатыя валы. Рабочы зборачнага цэху т. **Даражка** пры зборцы трактараў перакруціў болт, а брыгадзір цэху тав. **Кавалёў** разьбіў шчыток. Усе гэтыя «дробязі» затрымалі зборку на некалькі дзён.

Можна прывесьці яшчэ рад фактаў, якія сьведчаць аб нядбайных адносінах да работы, аб слабой працоўнай дысцыпліне. Людзі забываюць, што дрэнна адрамантаваны трактар выйдзе са строю ў першыя-ж дні сяўбы. Гэта трэба папярэдзіць зараз-жа, добра правяраючы якасьць рамонту.

Надзвычай дрэнна з ахоўвай трактараў. Яны стаяць на двары пад адкрытым небам, занесены сьнегам. Зусім лёгка можна зьняць любую дэталь і вынесьці са двара. Ніхто за гэтым ня сочыць, ніхто не правярае.

Начны вартаўнік **Райман** прыходзіць на работу, калі яму ўздумаецца і вельмі рэдка бывае на месцы.

«Зьвязда» ўжо адзначала «клопаты» Трактарацэнтру аб забесьпячэньні МТМ варштатамі. Для паўнаты малюнку дадамо пару фактаў. МТМ мела адно тачыла, якое поўнасьцю задавальняла патрэбы. Аднак, Трактарацэнтр чамусьці прыслаў яшчэ два тачылы. Яны засталіся ляжаць мёртвым капіталам, хоць іншыя МТМ адчуваюць патрэбу ў гэтых прыладах. Не забраны яшчэ таксама тры сьвідравальныя варштаты, «ласкава» прысланыя Трактарацэнтрам яшчэ ў лістападзе і сьнежні месяцах.

Р. Д.

Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

1. Устанавіць тэрмін скліканьня Ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў — 21 сакавіка. У парадак дня ўключыць наступнае пытаньне: **Трэцяя бальшавіцкая сяўба і задачы калгасьнікаў.** Дакладчыкі т. т. Шаранговіч, Рачыцкі і Герцовіч.

2. Вызначыць колькасьць дэлегатаў зьезду — 750 чал., колькасьць дэлегатаў ад раёну паставіць у простую залежнасьць ад проценту калектывізацыі і паспяховай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы данага раёну.

Указаць раённым арганізацыям, што пасылаць дэлегатаў могуць сапраўды перадавыя калгасы з асяродзьдзя сапраўдных ударнікаў калгаснай вытворчасьці як брыгадзіраў, старшынь калгасаў, так і перадавых калгасьнікаў. Пры выбарах дэлегатаў абавязкова ўлічваць нацыянальны склад насельніцтва раёну, сельсавету, калгасаў з тым, каб на зьезд забясьпечыць пасылку калгасьнікаў-ударнікаў нацменшаў. Абавязкова ў складзе дэлегатаў павінны быць удзельнікі Ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў.

3. Выбары дэлегатаў на зьезд праводзяцца непасрэдна на адкрытых калгасных сходах. Катэгарычна забараніць выбары дэлегатаў на раённых зьлётах.

Выбары на калгасны зьезд праводзяцца на тых калгасных сходах, на якіх будуць рабіцца справаздачы дэлегатаў раённага зьлёту калгасьнікаў. Лічыць абавязковым, каб выбары былі праведзены да 15 сакавіка.

4. У мэтах найлепшай падрыхтоўкі да правядзеньня калгасных сходаў і найбольш правільных выбараў дэлегатаў — правесьці паміж 4-м і 8-м сакавіка партыйныя і камсамольскія сходы калгасных ячэек, на якіх абгаварыць пытаньні, зьвязаныя з раённымі і ўсебеларускім зьездам калгасьнікаў.

5. Указаць ўсім парткомам, што дэлегаты з раёнаў накіроўваюцца арганізаваным парадкам адначасова ўсім складам.

6. Выходзячы з вопыту арганізацыі ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў, прапанаваць Менгаркому КП(б)Б і ЦСПСБ арганізаваць сустрэчу дэлегатаў рабочымі арганізацыямі і палітычнае абслугоўваньне дэлегатаў. Абавязаць гарком і ЦСПСБ распрацаваць і прадставіць аргкамісіі ў 3-дзённы тэрмін меркаваньні аб арганізацыі сустрэчы, паказаў дасягненьняў сацбудаўніцтва, вопытаў сацыялістычных форм працы — дэлегатам зьезду.

7. Лічыць неабходным арганізаваць у цэнтральным друку трыбуну зьезду з такім разьлікам, каб ужо за некалькі дзён да зьезду перадавыя калгасы і дэлегаты зьезду маглі-б дзяліцца вопытам узорнай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

8. Лічыць неабходным скарыстаць падрыхтоўку і сам зьезд для ўмацаваньня змычкі шырокіх калгасных мас з РСЧА і арганізацыі сустрэчы дэлегатаў з чырвонаармейскімі часьцямі ў часе зьезду.

9. Лічыць неабходным правесьці ў часе зьезду рад нарад (па пытаньнях партработы, работы з калгасным актывам, жанработы і г. д.). Даручыць аргкамісіі дэтальна распрацаваць гэта пытаньне.

Адначасова лічыць неабходным правядзеньне ў часе зьезду раду нарад для абагульненьня вопыту па калгасным будаўніцтве. Даручыць калгаснаму інстытуту і Наркамзему не пазьней 10 сакавіка 1933 г. прадставіць свае прапановы па гэтых пытаньнях.

10. Лічыць неабходным у часе зьезду зацьвердзіць дагавор аб сацспаборніцтве паміж БССР і Заходняй вобласьцю.

11. Прапанаваць партыйным арганізацыям, цэнтральнаму і раённаму друку неадкладна разгарнуць масава-палітычную кампанію вакол падрыхтоўкі да зьезду, арганізуючы сацспаборніцтва калгасаў і брыгад на права пасылкі дэлегатаў на зьезд, паказваючы ўзоры ўдарнай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Прапанаваць раённым арганізацыям усямерна скарыстаць дэлегатаў усесаюзнага калгаснага зьезду ў якасьці дакладчыкаў на калгасных сходах.

Прапанаваць гарадзкім і заводзкім партыйным арганізацыям разгарнуць масава-палітычную работу на прадпрыемствах вакол падрыхтоўкі да зьезду, дамагаючыся таго, каб рабочыя фабрык і заводаў, асабліва тых прадпрыемстваў, якія зьвязаны з падрыхтоўкай да сяўбы (прадпрыемствы, якія вырабляюць запасныя часткі і шэфствуюць над МТС і МТМ і г. д.), — адказалі ўдарнай работай на падрыхтоўку да калгаснага зьезду.

12. Абавязаць ЦК і РК камсамолу разгарнуць у сувязі са зьездам масавую работу сярод калгаснай моладзі, арганізуючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, забясьпечыўшы пасылку на зьезд сапраўдных ударнікаў з радоў калгаснай моладзі.

13. Зацьвердзіць наступны склад аргкамісіі па кіраўніцтву падрыхтоўкай да калгаснага зьезду — т. т. **Шаранговіча, Картукова, Рачыцкага, Калачука, Чарвякова, Чарнушэвіча, Гейсовіча, Рубінштэйна, Ленцнэра.**

За страту клясавай пільнасьці група кіруючых работнікаў НКЗ выключана з партыі

Пастанова аб'яднанага пасяджэньня прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і прэзыдыуму Мен. ГарКК КП(б)Б

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і разгорнутай клясавай барацьбы з кулаком і апартуністамі розных масьцей унутры партыі, КП(б)Б, разьбіўшы ў свой час прышчэпаўшчыну і нацдэмаўшчыну, дасягнула велізарнейшых посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі (да 1933 г. калектывізавана 42 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, пашырана пасеўная плошча ў параўнаньні з даваенным часам на 1.240 тыс. га, пад саўгасамі знаходзіцца плошча да 590 тыс. га, створана 57 МТС, трактарны парк БССР дасягае амаль 3 тыс. трактароў).

У новых абставінах, разьбітыя, але яшчэ недабітыя прышчэпаўскія і шкодніцкія контр-рэвалюцыйныя элементы ў замаскаванай форме зрабілі, аднак, весьці старую кулацкую контр-рэвалюцыйную зямельную палітыку, імкнучыся рэстаўраваць капіталістычныя элементы ў БССР.

Па ініцыятыве контр-рэвалюцыйных прышчэпаўскіх элементаў, якія засталіся ў НКЗБ, і пры простым патураньні кіраўнікоў-камуністаў у зямельныя органы набіраліся клясава-чужыя элементы, якія ў свой час былі непасрэднымі праваднікамі прышчэпаўскай, нацдэмаўскай палітыкі ў Беларусі і наступова вычысьцяліся з апарату лепшыя савецкія спэцыялісты.

Кіраўнікі-камуністы Наркамзему і партыйная ячэйка, ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні партыі, што барацьба з прышчэпаўшчынай і нацдэмаўшчынай ня скончана, што рэшткі прышчэпаўшчыны і нацдэмаўшчыны, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам, будуць імкнуцца на асобных вучастках сваёй работы сарваць пасьпяховую сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі БССР,—ня ўлічылі і не зразумелі новых манёўраў клясава-варожых элементаў і жорсткай клясавай барацьбы, якую праводзіць партыя з кулаком і яго агентурай унутры партыі.

Усе паводзіны гэтых камуністаў зьяўляюцца яркім выразам страты клясавай рэвалюцыйнай пільнасьці, выразам яўнага зацiску самакрытыкі і гніла-ліберальных адносін з іх боку да клясава-варожых і антыпартыйных элементаў, а таксама паказальнікам буржуазнага перараджэньня асобных камуністаў, якія апынуліся ў палоне групы контр-рэвалюцыйных спэцыялістаў, аказаўшы гэтым апошнім неабмежаванае давер'е, і штампаваўшы іх контр-рэвалюцыйную дзейнасьць.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і прэзыдыум Мінскай гар. КК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

1. **Масюкова К. Н.**—член КП(б)Б з 1921 г., служачы, атрымаў у часе чысткі партыі ў 1930 г. вымову за скрыўленьне клясавай лініі ў рабоце апарату НКЗБ, будучы намесьнікам наркома земляробства, фактычна тармазіў работу партыі ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ашукваў партыю і савецкі ўрад у гэтай справе, фактычна праводзячы ў сваёй рабоце старую палітыку прышчэпаўшчыны, якая выявілася ў насаджэньні хутароў і пасёлкаў, складаньні шкодніцкіх плянаў сяўбы, жывёлагадоўлі, меліярацыі і інш., выданьні палітычна-шкоднай інструкцыі па землеўпарадкаваньні, зацьвярджэньні розных шкодніцкіх плянаў землеўпарадкаваньня саўгасаў і калгасаў, у фактычнай ліквідацыі апарату землеўпарадчыкаў, што зрывала своечасовае землеўпарадкаваньне саўгасаў і калгасаў; апіраўся ў рабоце на актыўных праваднікоў прышчэпаўскай палітыкі ў мінулым,—як буржуазнага перараджэнца **з партыі выключыць.**

Прымаючы пад увагу, што тав. Масюкоў мае вялікі стаж кіруючай і адказнай работы, даць магчымасьць яму працаваць на нізавой рабоце—у калгасе, саўгасе, з тым, каб пасьля аднаго-двух год работы пры дадатным водзыве партыйнай і грамадзкай арганізацыі ён змог уступіць у партыю на агульных падставах.

2. **Паніматка П. Р.**—член КП(б)Б з жніўня 1917 году, будучы намесьнікам наркома, як камуніст-спэцыяліст (аграном), непасрэдна зацьвярджаў палітычна-шкодную інструкцыю па землеўпарадкаваньні, зацьвярджаў розныя шкодныя пляны землеўпарадкаваньня саўгасаў і калгасаў, сваёй аб'ектыўна-дрэннай работай фактычна зрываў правядзеньне ў жыцьцё мерапрыемстваў партыі і ўраду па павышэньні ўраджайнасьці, увядзеньні севазваротаў і землеўпарадкаваньні саўгасаў і калгасаў, непасрэдна набіраў у апарат неправераных спэцыялістаў, якія аказаліся шкоднікамі,—як буржуазнага перараджэнца **з радоў партыі выключыць.**

Прымаючы пад увагу ранейшыя рэвалюцыйныя заслугі тав. Паніматка, даць магчымасьць яму працаваць на нізавой рабоце ў калгасе, саўгасе з тым, каб праз год пры дадатным водзыве партыйных і грамадзкіх арганізацый ён змог уступіць у партыю на агульных падставах.

3. **Матус Б. І.**—член КП(б)Б з 1920 г., служачы, у 1931 г. атрымаў суровую вымову за антыпартыйныя паводзіны з забаронай на працягу году займаць адказныя кіруючыя пасады, зьяўляючыся кіраўніком сэктару плянаваньня і фінансаваньня, складаў і штампаваў яўна шкодніцкія пляны па асобных галінах сельскай гаспадаркі, апіраўся ў сваёй практычнай рабоце на неправераных спэцыялістаў, дапусьціў моманты сямейнасьці і п'янства, за што тав. Матуса, які, ня гледзячы на зробленае партыяй у 1931 г. суровае папярэджаньне, не апраўдаў давер'я партыі, **з радоў партыі выключыць.**

Прымаючы пад увагу, што тав. Матус мае вялікі стаж кіруючай і адказнай работы, даць магчымасьць яму працаваць на нізавой рабоце ў калгасе, саўгасе з тым, каб пасьля аднаго-двух год пры дадатным водзыве партыйных і грамадзкіх арганізацый ён змог уступіць у партыю на агульных падставах.

4. **Грузакова І. К.**—член КП(б)Б з 1925 г., служачы, па спэцыяльнасьці вэтэрынарны доктар, атрымаў суровую вымову ў 1929 годзе за антыпартыйны ўчынак, кіраўнік сэктару вэтэрынарыі, яўна зрастаўся са шкоднікамі контр-рэвалюцыйнымі элемэнтамі, арганізоўваючы разам з імі папойкі, зацьвярджаў контр-рэвалюцыйную шкодніцкую работу асобных спэцыялістаў, якая выявілася ў выпуску недобраякаснага вірусу і ў прышчэпцы яго жывёле, у завозе чумных сьвіней у Ленінградзкую і Маскоўскую вобласьці, у зрыве пляну барацьбы з эпізоатыямі жывёлы,—як буржуазна-перарадзіўшагася і разлажыўшагася **з радоў партыі выключыць.**

5. **Ісаенка Ф. М.**—член КП(б)Б з жніўня 1917 году, выключаўся ў 1924 годзе з партыі—за сувязь з варожым элементам, атрымаў суровую вымову ў 1929 годзе ў часе чысткі партыі за ліберальныя і прымірэнчыя адносіны да нацдэмаўшчыны і зацiск самакрытыкі, зьяўляючыся інспэктарам сэктару кадраў і часткова замяшчаючы загадчыка сэктару, ня толькі ня прыняў мер да ачысткі апарату НКЗБел. ад клясава-варожых элементаў, але сьвядома прыстройваў іх у цэнтральных зямельных і навукова-дасьледчых апаратах, фармальна, па-бюракратычнаму адносіўся да сваіх абавязкаў, як камуніст-спэцыяліст (агранам), ня толькі ня выкрыў шкодніцкую работу контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, але сваімі антыпартыйнымі выступленьнямі на агульных сходах ячэйкі браў іх пад абарону,—як неапраўдаўшага давер'я партыі, **з радоў партыі выключыць.**

6. **Шчарбакова Г. С.**—член КП(б)Б з 1924 г., па сацыяльным становішчы рабочы. У 1933 г. атрымаў суровую вымову з папярэджаньнем за марынаваньне на працягу паўгода скаргаў сялян аб няправільным землеўпарадкаваньні ў Рэчыцкім раёне, будучы членам калегіі НКЗБел. і кіраўніком сэктару землеўпарадкаваньня і арганізацыі тэрыторыі і старшынёй тэхнічна-воднага камітэту, непасрэдна зацьвярджаў шкодніцкія пляны па землеўпарадкаваньні саўгасаў і калгасаў, а таксама шкодніцкія пляны па меліярацыі, удзельнік складаньня інструкцыі па землеўпарадкаваньні калгасаў і саўгасаў па сыстэме геамэтрычных клетак, што зьяўляецца шкодніцкім, дапусьціў вялікую засьмечанасьць свайго апарату клясава-варожымі элементамі, якія беспакарана праводзілі шкодніцкую палітыку ў плянаваньні, меліярацыі і землеўпарадкаваньні саўгасаў і калгасаў, дапусьціў сьвядомую зацяжку і зрыў шкоднікамі плянаў землеўпарадкаваньня, **з радоў партыі выключыць.**

Прымаючы пад увагу, што тав. Шчарбакоў мае вялікі стаж адказнай і кіруючай работы, даць магчымасьць яму працаваць на нізавой рабоце ў калгасе, саўгасе з тым, каб пасьля аднаго-двух год пры дадатным водзыве партыйных і грамадзкіх арганізацый ён змог уступіць у партыю на агульных падставах.

7. **Караняка Ф. В.**—член КП(б)Б з 1918 г., па сацыяльным паходжаньні селянін. У 1930 годзе ў часе чысткі партыі атрымаў вымову за нядобрасумленныя адносіны да работы, зьяўляючыся дырэктарам Дзяржземтрэсту, страціў клясавую пільнасьць і папаў у палон контр-рэвалюцыйных спэцыялістаў, дапусьціў значную засьмечанасьць апарату клясава-варожымі элементамі, якія беспакарана праводзілі яўна-шкодніцкую палітыку па землеўпарадкаваньні саўгасаў і калгасаў (сьвядомая зацяжка і зрыў землеўпарадкаваньня саўгасаў і калгасаў, шкодніцкае землеўпарадкаваньне саўгасаў, правядзеньне шкодніцкага землеўпарадкаваньня ў розных раёнах на плошчы 50.000 га па сыстэме геамэтрычных клетак), як неапраўдаўшага давер'я партыі, **з радоў партыі выключыць.**

8. **Еўдакімаву У. М.**—член КП(б)Б з 1920 г., па сацыяльным паходжаньні селянін, атрымаў вымову ў 1930 годзе ў часе чысткі партыі за правы ўхіл, будучы дырэктарам меліярацыйнага трэсту і не згаджаючыся з цэлым радам няправільных плянаў меліярацыі асобных масіваў балот, палітычна недаацаніў іх (пляны), як шкодніцкія, і рашуча не паставіў гэта пытаньне перад вышэйшымі партарганамі, як член партыі дапусьціў гніла-ліберальныя адносіны да хваравітых зьявішч у рабоце апарату, асабліва па сэктары землеўпарадкаваньня і арганізацыі тэрыторыі—**абвясьціць суровую вымову.**

9. **Варабёву С. Л.**—член КП(б)Б з 1918 г., па сацыяльным становішчы рабочы, былы член калегіі НКЗБел., зараз сакратар Бягомльскага РК КП(б)Б, будучы кіраўніком сэктару тэхкультур, даверыў контр-рэвалюцыйным спэцыялістам свайго сэктару і штампаваў іх шкодніцкую дзейнасьць, як сакратар ячэйкі ня вёў ніякай барацьбы з фактамі разлажэньня і перараджэньня асобных камуністаў, з фактамі скажэньня лініі партыі ў апараце НКЗБел., не рэагаваў на засьмечанасьць апарату клясава-варожымі элементамі, набіраў у апарат актыўных праваднікоў (у свой час) прышчэпаўскай палітыкі, замест разгортваньня партыйна-масавай работы дапусьціў яўны зацiск самакрытыкі і нерэагаваньне на неаднаразовыя сыгналы друку аб хваравітых зьявішчах у рабоце НКЗБел.,—прымаючы пад увагу, што ён адзін з усіх, што прыцягваліся да адказнасьці па гэтай справе, шчыра прызнаў свае памылкі і расказаў аб усім тым, што рабілася ў апараце НКЗБел., асабліва ў ячэйцы, абмежавацца абвяшчэньнем **суровай вымовы з папярэджаньнем** і зьняць з работы сакратара РК КП(б)Б.

10. Даручыць парткалегіі ЦКК КП(б)Б і Мен. гар. КК КП(б)Б разглядзець і вырашыць пытаньне аб прыцягненьні да партадказнасьці іншых камуністаў, якія скампраметавалі сябе па рабоце ў НКЗБел.

11. Прапанаваць усім гар. і райкомам КП(б)Б і гар. КК-РСІ разгарнуць шырокую прапрацоўку гэтага рашэньня з мэтай мабілізацыі шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў на максымальнае ўзмацненьне клясавай пільнасьці, разгортваньне самакрытыкі, рашучую барацьбу з малейшымі фактамі скажэньня лініі партыі, супроць бюракратызму і на ачыстку апарату ад клясава-варожых і антысавецкіх элементаў.

АБ ПАМЫЛКАХ ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ

(У рэдакцыю „Праўды“)

У «Праўдзе» ад 25 лютага г. г. быў зьмешчан ліст настаўніка тав. **Сьцяпура,** мястэчка Бобр, Крупскага раёну, пад загалоўкам: **«Буржуазныя нацыяналісты арудуюць».**

Сакратарыят ЦК КП(б)Б як толькі атрымаў гэты нумар «Праўды» (26-II—33 г.), зараз-жа вылучыў на чале з загадчыкам культпропам ЦК тав. **Ляўковым** тройку для прыняцця на месцы ўсіх мер па прыцягненьні канкрэтных вінаватых да найстражэйшай адказнасьці за скажэньне ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі.

ЦК КП(б)Б і Саўнарком прызнаюць, што гэты факт пацьвярджае, што **партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі не вядуць бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму і ў радзе выпадкаў патураюць буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям.**

Факты, паказаныя ў артыкуле спэцыяльнага карэспандэнта «Праўды» тав. **Давідзюка—«Пад фальшыва-нацыянальным сьцягам»** пры самай шырокай праверцы аказаліся правільнымі. Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, у сувязі з указаным артыкулам, абмяркоўваў скажэньні нацыянальнай палітыкі ў Беларусі.

У сваёй пастанове (аб'яднаны пленум прызнаў, што:

«Гэтыя клясава-варожыя вылазкі і дзейнасьць антысавецкіх, эсэраўскіх, нацыянал-дэмакратычных і бундаўскіх элементаў, якія часта выступаюць пад фальшыва-нацыянальным сьцягам, магла мець месца ў БССР галоўным чынам таму, што, ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні і перасьцярогі з боку ЦК УсеКП(б), партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі не зрабілі для сябе сапраўды бальшавіцкіх вывадаў з урокаў нацдэмаўшчыны, прышчэпаўшчыны—разьбітых, але яшчэ не дабітых у БССР і якія актывізуюцца за апошні час. Партыйныя і савецкія арганізацыі БССР яшчэ па-бальшавіцку не перабудаваліся ў бок канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва і дакладнага бальшавіцкага выкананьня партыйных дырэктыў, не разгарнулі яшчэ сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, ня выкрылі самоўна-панскіх мэтадаў кіраўніцтва і славеснай дэклярацыйнасьці, не разгарнулі яшчэ бальшавіцкай барацьбы з буржуазнымі, перараджэнскімі, нацыянал-апартуністычнымі і гніла-ліберальнымі элементамі, пралезшымі ў партыю».

Бюро ЦК КП(б)Б прыняло канкрэтныя меры ў адносінах асоб, якія скажаюць нацыянальную палітыку партыі або сваёй бязьдзейнасьцю патураюць скажэньню бальшавіцкіх прынцыпаў інтэрнацыяналізму. Абвешчана вымова наркамасьветы тав. **Платуну,** суровая вымова кіраўніку ДВБ тав. **Некрашэвічу,** вымова загадчыку сэктарам мастацтва культпропу ЦК КП(б)Б тав. **Модэлю**, нарэшце, зьняты з работы заг. Галоўлітам тав. **Сініцкі** і рад іншых работнікаў (рэдакцыі часопісаў, зьмясьціўшых варожыя артыкулы, інстытут гісторыі партыі і г. д.) за патураньне буржуазна-нацыяналістычным тэндэнцыям.

У сьвятле ліста беларускага настаўніка т. **Сьцяпура** ЦК КП(б)Б і Саўнарком лічаць, што **прынятыя да гэтага часу меры зьяўляюцца далёка невыстарчальнымі.** Партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі выпусьцілі з-пад увагі, што Ўсесаюзная Камуністычная партыя і Ўрад Савецкага саюзу, аказваючы ўсялякае падтрыманьне будаўніцтву нацыянальнай па форме і інтэрнацыянальнай (пралетарскай) па зьмесце культуры і выхаваньню бальшавіцкіх нацыянальных кадраў, ставяць ва главу вугла **«палітыку зьбліжэньня пралетараў і паўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы»** (з праграмы УсеКП(б).

Таму зусім нецярпімы маючыя месца ў Беларусі, аб чым паведамляе там сама тав. Сьцяпура, факты простай забароны карыстаньня расійскай мовай у зваротах да дзяржаўных або якіх-небудзь іншых органаў Беларусі, таксама, як зусім недапушчальны факты праследваньня за расійскую гутарку ў прыватным жыцьці. Гэтыя скажэньні ва ўмовах перамогі нацыянальнай культуры ў Беларусі зьяўляюцца выгоднымі толькі нашым клясавым ворагам.

Прызнаючы памылкі партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі, ЦК КП(б)Б і Саўнарком прымуць рашучыя меры, каб у корані зьнішчыць кулацка-буржуазныя нацыяналістычныя тэндэнцыі і каб на справе весьці бальшавіцкую барацьбу за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму.

ЦК КП(б)Б і Саўнарком у бліжэйшыя-ж дні паведамяць у «Праўду» аб мерах, прынятых у адносінах канкрэтных вінаватых у сувязі з лістом настаўніка т. Сьцяпура, а таксама аб іншых дадатковых мерапрыемствах па барацьбе з буржуазна-кулацкімі нацыяналістычнымі тэндэнцыямі.

З камуністычным прывітаньнем
Сакратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

«Праўда».

Лёзам супроць прагульшчыка

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат імя 15-годзьдзя Кастрычніка мае бясспрэчныя дасягненьні ў справе перабудовы рабочага снабжэньня. У выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 4 і 19 сьнежня 1932 году, уся кааперацыйная гаспадарка, якая абслугоўвае рабочых камбінату, перадана заводакіраўніцтву. Арганізован ЗРК лесакамбінату, на чале якога пастаўлен намесьнік дырэктара па рабочым снабжэньні тав. **Энцін.** ЗРК стаў аддзелам камбінату. За работу ЗРК адказвае ня толькі яго непасрэднае кіраўніцтва, але і дырэкцыя камбінату, уся заводзкая грамадзкасьць.

Для паляпшэньня абслугоўваньня рабочых і служачых значна пашырана сетка гандлёвых адзінак. Лік крам узрос з 7 да 14, лік ларкоў — з 4 да 6. Адкрыты спэцыяльны магазын для лепшых ударнікаў вытворчасьці і членаў ІТР.

Гандлёвая дзейнасьць крам характарызуецца лічбамі таваразвароту за мінулы год. У першым квартале плян таваразвароту быў выканан на 97,1 проц., у другім квартале — на 90,6 проц., у трэцім — на 48,8 проц. і чацьвертым — на 108,2 проц. Як бачым, самы большы процант выкананьня пляну таваразвароту падае на чацьверты квартал, калі перабудова рабочага снабжэньня была ў самым разгары.

Павялічэньне колькасьці крам і ларкоў дапамагло ліквідацыі чаргі. Калі раней адна крама абслугоўвала 1.725 чал., дык зараз на кожную краму прыпадае ў сярэднім 857 чал. Ліквідацыі хвастоў спрыяла новая сыстэма водпуску прадуктаў і прамтавараў: з 1.000 чал., прымацаваных да крамы № 1, па чарзе адпускаюцца тавары 100 чал. з першай зьмены, 100 чал — з другой зьмены і 100 — з трэцяй. Гэту работу арганізуюць рабочыя — члены казкамісіі і члены кантрольных пастоў непасрэдна ў цэхах.

Да рэчы аб кантрольных пастох. Гэта справа тут новая. Да кожнага цэху прымацавана пэўная крама ЗРК. З лепшых ударнікаў выбран кантрольны пост у складзе 5—9 рабочых. Усяго створана 9 пастоў. Задачай кожнага паста зьяўляецца штодзенны кантроль за дзейнасьцю крам. Між іншым гэтыя пасты ўжо выкрылі злоўжываньні з хлебам і інш.

ЗРК камбінату, стаўшы неадлучнай часткай вытворчасьці, шырока разгарнуў дэцэнтралізаваныя самазагатоўкі. Плян выканан на 106,5 проц.

Самае важнае месца займае грамадзкае харчаваньне. На камбінаце пабудаваны дзьве кухні - разьмеркавальнікі, адна вялікая агульная сталоўка з трыма аддзяленьнямі: рабочых абедаў, ІТР і дыэтычнае аддзяленьне. У кожным цэху арганізавана свая цэхавая сталоўка: усяго такіх сталовак 11.

Але галоўнае — у якасьці абедаў. У гэтых адносінах за апошні месяц зроблен значны крок наперад. Калі ў кастрычніку мясных абедаў было 13, у лістападзе — 18, дык у сьнежні і ў студзені — на 25. Павысілася калёрыйнасьць абедаў. Страва запраўляецца здавальняючай колькасьцю прыпраў. Побач з гэтым зьніжаецца **кошт** абедаў. Калі раней мясны абед каштаваў 1 руб., дык зараз за яго плоцяць 87 кап., посны абед каштаваў 80 к., а зараз 54 кап. Паляпшэньне якасьці абедаў ідзе за кошт разгортваньня самазагатовак. Самазагатоўленыя прадукты займаюць у агульнай харчовай базе сталоўкі 50—60 проц.

Пры прыгараднай гаспадарцы камбінату ёсьць сьвінная фэрма, якая сыстэматычна снабжае сталоўку тлушчамі. За мінулы год сьвінафэрма дала для сталоўкі 9.453 кілёгр. сала.

Найлепшыя ўзоры перабудовы работы мы бачым у галіне снабжэньня хлебам. Пры заводакіраўніцтве арганізаваны стол пайшчыкаў, які праводзіць сваю работу ў цеснай сувязі з адміністрацыяй пад лёзунгам барацьбы з прагуламі, з дэзарганізацыяй вытворчасьці.

У рэзультаце дасканалага перавучоту высьветлілася, што да крам ЗРК камбінату прымазалася 412 чал., якія ня маюць ніякага дачыненьня да вытворчасьці. Апрача таго, было 30 «мёртвых душ». Такім чынам ЗРК камбінату 442 пайкі выкідвала на вецер. Зараз гэтыя людзі вычышчаны, што дало эканоміі толькі на адным хлебе 1.500 клгр. у месяц.

Наборныя дакуманты выдаюцца табэльшчыку па спэцыяльным патрабаваньні адміністрацыі цэху. Патрабаваньне складаецца, выходзячы з наяўнай колькасьці рабочай сілы. Для таго, каб прагульшчык ня мог атрымаць хлеба, уведзен такі парадак: табэльшчыку выдана спэцыяльная пячатка, якою ён кожныя два дні адзначае зьяўленьне на работу і выпрацоўку за зьмену кожнага рабочага на хлебных картках. Без гэтай пячаткі крама хлеба не выдае.

Пры звальненьні разьлік робіцца толькі пасьля здачы наборных дакумантаў. Ад лятуноў рабочыя самі адбіраюць прадуктовыя карткі. Напрыклад калі з базы сыравіны ўцёк лятун **Натачэй Н.**, дык яго сусед па рабоце тав. **Суравец** пайшоў на кватэру да лятуна і адабраў ад яго наборныя дакуманты.

Прагульшчыкі, прыпёртыя да сьцяны, яны імкнуцца атрымаць прадукты шляхам розных камбінацый і злоўжываньняў. «Рабочы» **Марозаў** падрабіў пячатку свайго цэху і такім чынам, не працуючы, атрымліваў хлеб у краме. Такім-жа шляхам пайшоў і другі зрыўшчык прамфінпляну **Хрусанаў.** Рабочыя кантрольныя пасты выкрылі гэтых жулікаў і справа аб іх перадана судовым органам.

Устаноўлен кантроль і за крамамі. Хлебная крама кожныя два дні адлае справаздачу ў кантрольны стол пры бюро наборных дакумантаў камбінату. Кантрольны стол вядзе праверку паступленьня і выдатваньня хлеба. З дапамогай кантрольных пастоў выкрыта разбазарваньне хлеба ў дзьвёх крамах. Вінаватыя прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Так выглядае работа па перабудове рабочага снабжэньня на бабруйскім камбінаце ў адпаведнасьці з дырэктывамі ЦК і СНК.

Дасягненьні камбінату, аднак, ні ў якім разе не павінны затушаваць недахопы, якія ёсьць яшчэ ў рабочым снабжэньні. Асноўныя недахопы—зрывы з выдачай пайкоў і зусім слабае разгортваньне самазагатовак. Так, рабочым ня выдан яшчэ поўнасьцю ўвесь паёк за сьнежань. За час з 1 студзеня 1933 г. загатоўлена па канвэнцыйных цэнах толькі 87 тон бульбы і паўтары тоны мяса—больш нічога. 175.000 руб., адпушчаныя на самазагатоўкі ў першым квартале, ляжаць мёртвым капіталам. Тут апрача слабай работы камбінацкага ЗРК у наяўнасьці яшчэ злачынныя адносіны бабруйскай базы Белкаапсаюзу, якая сыстэматычна ня выконвае нарадаў па цэнтралізаваным снабжэньні. Такія-ж нядбайныя адносіны і з боку асобных райзагаў, да якіх прымацаваны камбінат для правядзеньня самазагатовак (Бабруйскі, Жлобінскі).

Глускі і Клічаўскі райзагі адмовіліся ад заключэньня дагавароў на дэцэнтралізаваныя загатоўкі. Трэба прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве дэцэнтралізаваных загатовак для снабжэньня рабочых камбінату.

Дэкаднік па праверцы перабудовы рабочага снабжэньня камбінат павінен скарыстаць для яшчэ большага паляпшэньня гэтай справы. Самаправерачныя брыгады бязумоўна выявяць цэлы рад буйных зрываў у пастаноўцы рабочага снабжэньня, якія трэба будзе неадкладна ліквідаваць.

П. Чыкун.

А. Джэлюк, А. Іофэ

Як „Віцебскі пралетары“ „зрывае маскі“

Супроць скажэньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі

Пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй паўнатой указваюць на актывізацыю контр-рэвалюцыйных, нацыянал-дэмакратычных элементаў у БССР, якія выступаюць і вядуць антысавецкую шкодніцкую работу, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам. Гэта актывізацыя магла мець месца ў БССР «галоўным чынам таму, што, ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні і папярэджаньні з боку ЦК УсеКП(б), партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі не зрабілі для сябе сапраўдных бальшавіцкіх вывадаў з урокаў нацдэмаўшчыны і прышчэпаўшчыны — разьбітых, але яшчэ недабітых у БССР і якія актывізуюцца ў апошнія часы» (з пастановы лютаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Гэтыя бальшавіцкія пастановы ставяць перад усёй КП(б)Б і перад нашым друкам, як вастрэйшай зброяй нашай партыі, задачу рашучай і пасьлядоўнай барацьбы з усякага роду спробамі клясавага ворага падняць нанава абшарпаны, контр-рэвалюцыйны, нацдэмаўскі сьцяг.

Было-б няправільна думаць, што гэта хоць у малейшай ступені зьмяншае пытаньне барацьбы з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на дадзеным этапе. Наадварот, гэтыя пастановы абавязваюць усе партыйныя арганізацыі і наш друк узмацніць барацьбу з праяўленьнямі вялікарасійскага шавінізму.

Як-жа зразумеў гэтыя зусім выразныя, вычарпальныя пастановы «Віцебскі пралетары»? На працягу паўгода газэта зусім не займалася пытаньнямі нацыянальнай палітыкі партыі і не вяла барацьбы з ухіламі ад яе. Газэта не ўзьняла на прынцыповую палітычную вышыню такія факты, як адкрытая прапаганда і агітацыя за насаджваньне нацдэмаўскіх, прышчэпаўскіх хутароў, якая праводзіцца ў хаце-чытальні Рудніцкага сельсавету. Не заўважыла цэлага раду скажэньняў нацыянальнай палітыкі з боку Віцебскага гарана. Абыйшла міма фактаў актывізацыі вялікадзяржаўных шавіністаў на чыгунцы, у ЦРК і г. д.

Жадаючы апраўдаць сваё маўчаньне і бязьдзейнасьць у пытаньнях нацыянальнай палітыкі партыі, «Віцебскі пралетары» раптоўна ў лютым месяцы зьмяшчае падвальны артыкул Рубінштэйна і Кагана, які ставіць задачай, як заяўляюць аўтары, «канчаткова сарваць маску» з вялікадзяржаўнікаў і нацдэмаў, што арудуюць у Віцебску.

Пачынаньне (пасьля паўгадовага маўчаньня) вельмі неабходнае і патрэбнае.

Як-жа яны зрываюць маскі?

Аказваецца, нацдэмаўшчыну аўтары шукаюць ва ўкраінскай трупе, а вялікадзяржаўнікаў — у дзяржцырку.

Даходзіць да таго, што аўтары артыкулу безапэляцыйна залічваюць у разрад вялікадзяржаўных шавіністаў усіх кіраўнікоў прадпрыемстваў, што не арганізуюць масавага гледача вакол БДТ-2.

Вось што яны пішуць: «Адсутнасьць масавай работы па арганізацыі рабочага гледача і палітычнай увагі да БДТ-2 ёсьць вынік вялікадзяржаўніцкіх адносін раду кіруючых работнікаў прадпрыемстваў да нацыянальнай па форме сацыялістычнай культуры».

Маска сарвана! Пастаўлены ўсе кропкі над «і». І так, калі хто два-тры разы глядзеў «Разлом» або «Першую конную», а чацьверты раз не захацеў пайсьці, дык той мэханічна залічваецца ў сьпіс вялікадзяржаўных шавіністаў.

У лісьце т. т. **Гікало і Галадзеда,** зьмешчаным у ЦО партыі «Праўдзе», проста ўказана: «Зусім нецярпімы маючыя месца ў Беларусі, аб чым паведамляе таксама тав. Сьцяпура, факты простай забароны карыстаньня расійскай мовай у зваротах да дзяржаўных або да якіх-небудзь іншых органаў Беларусі, таксама, як зусім недапушчальны факты праследваньня за расійскую гутарку ў прыватным жыцьці. Гэтыя скажэньні ва ўмовах перамогі нацыянальнай культуры ў Беларусі зьяўляюцца выгоднымі толькі нашым клясавым ворагам».

Гэтага не разумее газэта. Яна дайшла да таго, што стала на шлях простай забароны карыстаньня расійскай мовай. Карыстаньне расійскай мовай «Віцебскі пралетары» кваліфікуе, як праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму.

У гэтым-жа артыкуле імкненьне пад такім кутом гледжаньня абвінавачваецца драматычны гурток клюбу мэталістаў. «Мы толькі на днях, — піша газэта, — мелі спробу з боку гуртка самадзейнага мастацтва пры клюбе мэталістаў даць пастаноўку на расійскай мове». І гэта кваліфікуецца, «як вылазка клясавага ворага». Больш гаварыць аб гэтым няма чаго. Выступаць з такімі абвінавачаньнямі могуць толькі апалёгеты ваяўнічага нацыянал-дэмакратызму.

Хіба простая забарона карыстацца расійскай мовай ня ёсьць адна з старых нацыянал-дэмакратычных тэндэнцый «адмежаваньня Беларусі ад маскоўскага ўплыву?» Хіба гэта ня ёсьць адначасова тэндэнцый нацдэмаў аб адрыве ад «Масквы» і арыентацыі на капіталістычны Захад? Нам здаецца, што гэта так. Бо так, і толькі так, трэба ацэньваць падобнага роду злачынныя скажэньні нацыянальнай палітыкі партыі.

Толькі клясавы вораг можа адмаўляць тое, што посьпехі Савецкай Беларусі ёсьць рэзультат бальшавіцкага кіраўніцтва УсеКП(б) — рэзультат брацкай дапамогі працоўных Савецкага саюзу ў справе будаўніцтва нацыянальнай па форме і інтэрнацыянальнай (пралетарскай) па зьмесце культуры.

Нацыянальная палітыка партыі ёсьць палітыка «зьбліжэньня пралетараў і паўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы» (з праграмы УсеКП(б).

«Віцебскі пралетары», выступаючы супроць карыстаньня расійскай мовай, прадаставіў трыбуну для апалегетаў нацыянал-дэмакратызму адкрыта прапаведваць свае пагляды. Такое выступленьне рэвалюцыйнай пільнасьці мяжуе з простай здрадай лініі партыі.

Гэта невыпадковае выступленьне «Віцебскага пралетара», а цэлая сыстэма няправільных разуменьняў і скажэньняў нацыянальнай палітыкі партыі. У тым-жа артыкуле аўтары выкрываюць вялікадзяржаўных шавіністаў і знаходзяць іх... у трупе дзяржаўнага цырку, якая прыехала з Адэсы.

«Работнікі цырку ня хочуць ужываць беларускай мовы», і газэта ацэньвае гэта «як вялікадзяржаўныя і клясава-варожыя вылазкі».

Трэба-ж страціць галаву, каб патрабаваць ад актораў, прыехаўшых на гастролі з Адэсы, веданьня і ўжываньня ў рабоце беларускай мовы. Нават акцябровак і той ведае, што акторскі склад цыркаў знаходзіцца пераважна «на калёсах».

З такім-жа посьпехам гэты-ж цырк і актораў можна было-б абвінаваціць у вялікадзяржаўным шавінізме і за тое, што яны ня ведаюць туркменскай, украінскай, узбекскай, грузінскай і іншых моў многанацыянальнага СССР.

А пра сапраўдных вялікадзяржаўнікаў, якія там арудуюць (у Віцебску гэта асабліва адчуваецца), пра гэта «Віцебскі пралетары» ўпарта і злачынна маўчыць.

Газэта не зразумела ўсёй палітычнай важнасьці пастаноў ЦК КП(б)Б, у якіх з вычарпальнай паўнатой указвалася на актывізацыю разьбітых, але яшчэ недабітых рэштак нацдэмаўшчыны, прышчэпаўшчыны і г. д.

Замест таго, каб павесьці бальшавіцкую барацьбу з праяўленьнямі нацыянал-дэмакратызму ва ўстановах, школах, інстытутах і г. д., дзе нацыянал-дэмакратычныя элементы прабуюць узяць рэванш, газэта шукае нацдэмаў у прыехаўшай на гастролі ўкраінскай трупе.

«У гартэатры, — заяўляе «Віцебскі пралетары», — з боку прыехаўшай украінскай трупы былі спробы даць на падмостках рэчы, прасякнутыя нацыяналістычнымі матывамі. Пад фальшыва-нацыянальным сьцягам паасобныя элементы трупы імкнуцца апраўдаць сваю нацдэмаўскую практыку і дрэнную мастацкую якасьць сваёй работы».

Газэта не паведамляе ў чым імённа заключаюцца праяўленьні нацыянал-дэмакратызму ў гэтым тэатры і што імённа ім працягваецца пад фальшыва-нацыянальным сьцягам?

Можа тое, што актары тэатру выконвалі свае ролі на ўкраінскай мове? Усё гэта пакрыта невядомасьцю.

Але нас цікавіць другое. Чым тлумачыць, што «Віцебскі пралетары», паставіўшы сваёй задачай «канчаткова сарваць маскі», стаў шукаць ухіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму ў цырку, а нацдэмаўшчыну ва ўкраінскай трупе? Няўжо ў Віцебску так усё добра, што вялікадзяржаўнікі і нацыянал-дэмакраты абавязкова павінны быць прыежджымі?

Пастанова гаркому партыі, на якую спасылаюцца аўтары артыкулу (да рэчы, у пастанове таксама ёсьць няправільныя ўстаноўкі), гаворыць аб тым, што ёсьць факты актывізацыі вялікадзяржаўных шавіністаў і нацыянал-дэмакратаў у Віцебскім раёне. Аднак, пра гэта газэта і па сёньняшні дзень не гаворыць ні слова.

«Віцебскі пралетары» дапусьціў грубейшую палітычную памылку, якая скажае сутнасьць ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі.

Артыкул Рубінштэйна і Кагана накіраван не на ўмацаваньне пралетарскага інтэрнацыяналізму, а, наадварот, лье ваду на млын буржуазна-кулацкіх, нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў.

Гарком партыі і газэта павінны выправіць гэту грубейшую палітычную памылку. Яны павінны прыняць усе меры да таго, каб «Віцебскі пралетары» стаў сапраўднай вастрэйшай зброяй у руках партыі ў барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку. Газэта павінна па-бальшавіцку ўзяцца за тое, каб выкарчаваць рэшткі вялікадзяржаўніцкіх шавіністычных элемэнтаў і беларускіх нацыянал-дэмакратаў. Умацаваньне інтэрнацыянальнага выхаваньня, барацьба за пралетарскі інтэрнацыяналізм, супроць скажэньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі — вось што павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі як партыйнай арганізацыі, так і газэты.

Ключом да ажыцьцяўленьня гэтай задачы зьяўляюцца пастановы Цэнтральнага камітэту нашай партыі, вынесеныя на аснове ленінскіх указаньняў ЦК УсеКП(б) і яго баявога органу — «Праўды».

АБ РАБОЦЕ НАРКАМЗЕМУ І ТРАКТАРАЦЭНТРУ БССР

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б, зацьверджаная аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК КП(б)Б

1. Факты, паведамленыя ў артыкуле т. Віндаровіча ад 29 студзеня 1933 г., і факт выкрыцьця шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы, сьведчаць аб абсалютна нездавальняючай увазе да сельскай гаспадаркі ў цэлым і партработы на вёсцы, у прыватнасьці з боку партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі.

Актыўная роля эсэраўскіх, прышчэпаўскіх, нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў у контр-рэвалюцыйным шкодніцтве, якія пралезьлі ня толькі ў савецка-гаспадарчы апарат, але ў радзе выпадкаў пралезьлі ў партыю, прыкрываючыся ў сваёй антысавецкай рабоце партбілетам, — гаворыць аб тым, што партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі невыстарчальна ўлічылі ўрокі былой раней прышчэпаўшчыны, не ліквідавалі, ня ўскрылі і ня выкрылі канчаткова прышчэпаўскага, эсэраўскага і нацыянал-дэмакратычнага ўплыву.

Працяжная шкодніцкая работа ў сельскай гаспадарцы магла таксама мець месца ў выніку страты рэвалюцыйнай пільнасьці работнікамі, кіруючымі і працуючымі ў сельскай гаспадарцы, недапушчальна слабага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі супроць памылак і недахопаў у рабоце, наяўнасьці рэштак групоўшчыны і сямейнасьці ў партыйнай арганізацыі і кіруючым актыве, някрытычнага падыходу да падбору работнікаў для сельскай гаспадаркі і адсутнасьці бальшавіцкай праверкі і ацэнкі людзей па канкрэтных справах, у выніку гніла-ліберальных адносін да перараджэнскіх і антысавецкіх элемэнтаў, якія прыкрываюцца партбілетам і пралезьлі ў апарат зямельных органаў, а таксама славесна-дэкларацыйных адносін да правядзеньня генэральнай лініі партыі з боку работнікаў, якія непасрэдна займаюцца сельскай гаспадаркай як у цэнтры, так і на мясцох.

2. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б лічаць, што ўсё гэта і наяўнасьць раду памылак і буйнейшых недахопаў у рабоце вёскі, — паказваюць на нездавальняючае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і работай на вёсцы ў цэлым як з боку ЦК, ЦКК, КП(б)Б, так і СНК і ЦВК БССР.

Кіруючыя органы БССР (партыйныя і савецкія), ня гледзячы на рад указаньняў ЦК УсеКП(б), не перабудавалі сваёй работы так, каб забясьпечыць сапраўднае апэрацыйнае, канкрэтнае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, у асаблівасьці ўлічваючы ўрокі мінулага (прышчэпаўшчына, нацдэмаўшчына і г. д.), — не дабіліся такой перабудовы работы ў галіне сельскай гаспадаркі, якой патрабуюць абставіны пераходу вёскі ад аднаасобнай гаспадаркі да гаспадаркі аграмаджанай. Новая абстаноўка на вёсцы не зьмяншае, а наадварот патрабуе павышэньня ўвагі да сельскай гаспадаркі, патрабуе хуткага і своечасовага ўлажу і выкрыцьця новых манэўраў клясавага ворага ў яго барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва, у якім ёсьць яшчэ шмат слабых месц і куды вораг імкнецца ў першую чаргу нанесьці ўдар.

Разам з тым бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК падкрэсьліваюць, што раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі як у ходзе сяўбы мінулага году (недавыкананьне пасеўнага пляну, наяўнасьць элемэнтаў упіраньня вачэй, невыстарчальная барацьба супроць выступленьня кулацтва на радзе вучасткаў у сувязі з распадам калгасаў), так і ў ходзе загатовак, у асаблівасьці па льну, — паказалі, што яны да гэтага часу не зразумелі неабходнасьці па-бальшавіцку кіраваць усімі вучасткамі работы на вёсцы. Сёньняшняе становішча ільнозагатовак і падрыхтоўка да сяўбы паказваюць, што раённыя арганізацыі як партыйныя, так і савецкія, сельсаветы і ячэйкі, недаўлічылі ўрокаў мінулага і не прынялі ўсіх неабходных захадаў для выпраўленьня ў бліжэйшы-ж час паказаных недахопаў і дапушчаных у сваёй рабоце памылак.

3. Дрэнная праца па загатоўках і падрыхтоўцы да сяўбы, шкодніцтва ў сыстэме Наркамзему і Трактарацэнтру паказваюць на тое, што ў практыцы работы цэнтральных і раённых арганізацый Беларусі (партыйных і савецкіх) яшчэ маюць месца мэтады саноўна-бюракратычнага кіраўніцтва як раёнамі, так і саўгасамі, калгасамі і сельсаветамі замест сапраўдных ведаў, вывучэньня жыцьця і працы на месцах і людзей у іх, замест канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва месцамі, а таксама замест бальшавіцкага кантролю над працай кожнага камуніста, незалежна ад займанай ім пасады.

Такія адносіны да справы, побач з недаўлікам партыйнымі і савецкімі арганізацыямі асаблівасьцяй аналічнасьцяй гэтага году, а таксама гніла-ліберальныя адносіны да сельска-гаспадарчых загатовак стварылі недапушчальнае адставаньне ў выкананьні пляну сельска-гаспадарчых загатовак. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб ходзе загатовак па БССР дала правільную бальшавіцкую ацэнку такіх адносін да сельска-гаспадарчых загатовак і ўскрыла карэнныя памылкі і прычыны гэтага.

4. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК адзначаюць, што як Наркамзем т. Рачыцкі, так калегія і ўсе кіруючыя работнікі Наркамзему, пасьля разгрому контр-рэвалюцыйнай прышчэпаўшчыны, не зрабілі неабходных палітычных і практычных вывадаў у сваёй рабоце, не праявілі рэвалюцыйнай пільнасьці і не павялі рашучай барацьбы з рэштакамі контр-рэвалюцыйнай прышчэпаўшчыны, недаацэньваючы па сутнасьці кіраўніцтва сельскай гаспадаркай контр-рэвалюцыйным шкодніцкім элемэнтам (эсэры, прышчэпаўцы, рэшткі старога вялікадзяржаўніцкага чыноўніцтва і г. д.), чым палегчылі ім разгортваньне шкодніцкай працы.

ЦК і ЦКК асабліва падкрэсьліваюць, што намесьнікі наркамзему — Масюкоў і Панiматка, члены калегіі Наркамзему — Шчарбакоў, Караняка, Сокалаў, Грузакоў (зьняты з працы ў Наркамземе), былы кіраўнік Белтрактарацэнтру — Каршакевіч і Ільнатрактарацэнтру — Качук, ня гледзячы на рад сыгналаў аб засьмечанасьці апарату і шкодніцтва ў Наркамземе і Трактарацэнтры, аказаліся ў палоне контр-рэвалюцыйных шкодніцкіх спэцыялістаў і фактычна зрабіліся праваднікамі шкодніцкіх мерапрыемстваў.

5. Адной з асноўных прычын такога становішча работы апарату Наркамзему і Трактарацэнтру зьяўляецца тое, што ячэйкі Наркамзему і Трактарацэнтру не разгарнулі партыйна-масавай і арганізацыйнай партыйнай работы, у асаблівасьці па бальшавіцкім выхаваньні членаў ячэйкі, па сутнасьці не займаліся вывучэньнем становішча і праверкай работы апарату ў цэлым, яго работнікаў у паасобку, не забясьпечылі бальшавіцкага кантролю над работай кожнага камуніста, не разгарнулі бальшавіцкай самакрытыкі ў рабоце ячэек і апарату, дапусьцілі сямейнасьць, чынапачытаньне сярод камуністаў, гніла-ліберальныя адносіны да апартуністычных, перараджэнскіх элемэнтаў, якія пралезьлі ў апарат і прыкрываюцца партбілетам.

У выніку гэтага паказаныя партыйныя ячэйкі прайшлі міма працяжнай шкодніцкай работы ў апаратах Наркамзему і Белтрактарацэнтру і простага буржуазнага перараджэньня раду камуністаў.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК лічаць нездавальняючым кіраўніцтва савецкімі ячэйкамі з боку Менскага гаркому КП(б)Б і паказваюць на яго адказнасьць за такое становішча работы савецкіх ячэек і патрабуюць ад яго зараз-жа ўзмацненьня канкрэтнага кіраўніцтва работай партыйных ячэек савецкіх установаў, у першую чаргу Наркамзему і Трактарацэнтру.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Абвясьціць суровую вымову наркамзему БССР — т. Рачыцкаму, папярэдзіўшы яго аб тым, што калі ім ня будуць зроблены неабходныя вывады і не забясьпечана неадкладная перабудова ўсіх зьвеньняў апарату Наркамзему і сапраўднае бальшавіцкае кіраўніцтва работай сельскай гаспадаркі на падставе павышэньня сапраўднай рэвалюцыйнай пільнасьці ўсіх работнікаў Наркамзему, асабліва работай па падрыхтоўцы і правядзеньні сяўбы, — да яго будуць ужыты больш суровыя захады спагнаньня.

2. У дадатак да пастановы бюро ЦК ад 28-I—33 г. аб зьняцьці Масюкова з работы Упаўнаркамсаўгасаў — вывесьці Масюкова са складу членаў ЦК і пытаньне аб яго канкрэтных паводзінах перадаць на разгляд ЦКК. Таксама перадаць на разгляд ЦКК пытаньне пра Панiматку і Шчарбакова.

У сувязі з выяўленымі фактамі, якія сьведчаць аб адсутнасьці бальшавіцкай пільнасьці да контр-рэвалюцыйнай працы ў Трактарацэнтры з боку былых кіраўнікоў Трактарацэнтру — Каршакевіча і Качука і піттампаваньня імі шкодніцкіх дырэктыў, — зьняць з работы ў Сацзембанку Каршакевіча і Ільнатрактарацэнтры — Качука, вывесьці са складу пленуму ЦК — Качука і з рэвіз. камісіі ЦК — Каршакевіча і перадаць пытаньне аб іх канкрэтных паводзінах на разгляд ЦКК.

У сувязі з выяўленымі фактамі работы ячэйкі Наркамзему, адклікаць былога сакратара ячэйкі Наркамзему Вараб'ёва з работы сакратара Бягомльскага РК і перадаць пытаньне аб ім у ЦКК.

3. Факт выкрыцьця шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы мае буйнейшае палітычнае і гаспадарчае значэньне для ўсёй КП(б)Б. Гэта павінна быць са ўсёй сур'ёзнасьцю прадумана ўсімі бальшавікамі Беларусі і ў першую чаргу яе кіруючымі кадрамі з тым, каб на падставе бальшавіцкай самакрытыкі выкрыць да канца ўсе прычыны шкодніцтва і ў самы кароткі тэрмін не на словах, а на справе перабудаваць зьверху да нізу ўсю сваю работу па кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, да канца выправіўшы памылкі і недахопы ў гэтай галіне.

4. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК зварачаюць увагу партарганізацый БССР на тое, што БССР адстае ў выкананьні раду важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

ЦК УсеКП(б) папярэдзіў бальшавікоў Беларусі, што такое адставаньне зьяўляецца простым вынікам адсутнасьці завостранай бальшавіцкай барацьбы партыйнай арганізацыі Беларусі з перараджэнскімі антысавецкімі элемэнтамі, якія прыкрываюцца партбілетам, элемэнтамі ў партыі, якія часта вядуць антысавецкую працу пад фальшывым нацыянальным сьцягам.

ЦК і ЦКК падкрэсьліваюць, што да гэтага часу бальшавікі Беларусі не зрабілі неабходнага вываду з гэтых неаднаразовых папярэджаньняў ЦК УсеКП(б), што знаходзіць сваё яркае выяўленьне ў зусім нездавальняючым разгортваньні работ па падрыхтоўцы да сяўбы і ўмацаваньні калгасаў, у ходзе закупкі збожжа і асабліва па загатоўках ільну.

5. ЦК і ЦКК лічаць першачарговай задачай усёй КП(б)Б рашучае паляпшэньне кіраўніцтва падрыхтоўкай да веснавой сяўбы і сельскай гаспадаркай наогул. Павінны быць самым рашучым чынам выкаранены саноўна-панскія мэтады «кіраўніцтва», бюракратычнае вярхоглядзтва, нежаданьне ўвайсьці ў самыя надзённыя і штодзённыя пытаньні жыцьця і працы калгасаў, падмена жывога канкрэтнага кіраўніцтва цыркулярамі і шматлікімі рэзалюцыямі. Кіраўніцтва сельскай гаспадаркай павінна быць перабудавана ў адпаведнасьці з указаньнямі тов. Сталіна ў яго прамове на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б), заснаванае на рашучым павышэньні рэвалюцыйнай пільнасьці, веданьні калгасаў і людзей у іх, заснаванае на своечасовым выкрыцьці манэўраў клясавага ворага і рашучай барацьбе з ім, разуменьні новых абставін на вёсцы і адмоўных бакоў калгаснага гандлю.

6. У корані неабходна зьмяніць ацэнку і падыход да работнікаў. Ацэнка і падбор работнікаў павінны быць толькі па справе, па канкрэтнай рабоце і рэальных выніках гэтай работы. Неабходна ўзмацніць вылучэньне новых, выраслых, працаздольных і правераных кадраў, самым рашучым чынам адхіляючы ад работы тых камуністаў, якія ня ўмеюць працаваць і па-панску адносяцца да працы, і прыцягваючы да суровай адказнасьці тых, якія безадказна адносяцца да даручанай ім партыйнай работы.

7. ЦК і ЦКК адзначаюць, што пастанова студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і гістарычныя ўказаньні ў праграмнай прамове т. Сталіна аб рабоце на вёсцы да гэтага часу яшчэ па-баявому не ажыцьцяўляюцца ў партарганізацыі, у прыватнасьці зусім нездавальняюча разгорнута падрыхтоўка да веснавой сяўбы, пасьляховая падрыхтоўка правядзеньня якой зьяўляецца справай гонару ўсёй КП(б)Б і палітычнай праверкай на справе яе рэвалюцыйнай баяздольнасьці і здольнасьці практычна выконваць работы сяўбы. Існуючыя тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ставяць пад простую пагрозу яе своечасовае і якаснае правядзеньне.

ЦК і ЦКК абавязваюць усе ГК, РК, РВК, Наркамзем і Саўнарком дабіцца ў бліжэйшыя дні рашучага пералому ў ходзе падрыхтоўкі сяўбы і арганізаваць сапраўдную бальшавіцкую барацьбу за сканчэньне ссыпкі і ачысткі насеньня, за рамонт трактароў і с.-г. інвэнтару, за падрыхтоўку да сяўбы жывой і цяглавай сілы, за арганізацыю і ўмацаваньне вытворчай брыгады ў калгасе.

ЦК і ЦКК папярэджваюць усе раённыя арганізацыі, што ацэнка іх работы будзе пастаўлена ў простую залежнасьць ад таго, наколькі яны змогуць па-бальшавіцку ажыцьцявіць падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі і справіцца з яе правядзеньнем.

ЦК і ЦКК лічаць абсалютна нездавальняючым і зусім недапушчальным становішча работы ў галіне сельскай гаспадаркі раду савецкіх і гаспадарчых арганізацый (ад сельсаветаў, райзо, РВК — да цэнтральных устаноў уключна), якія падмяняюць жывую справу і канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам папяровым «кіраўніцтвам», якое зьяўляецца адным з галоўнейшых тармазоў у справе ўздыму і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Савецкія і гаспадарчыя арганізацыі, асабліва ў нізавых зьвеньнях, значна засьмечаны клясава-чужымі элемэнтамі (што выяўлена па сыстэме Наркамзему) у радзе месц, асабліва ў раёнах — зусім бязьдзейнічаюць, не жадаюць і ня ўмеюць займацца штодзённымі практычнымі пытаньнямі арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацаваньня калгасаў.

ЦК і ЦКК патрабуюць ад савецкіх органаў, райвыканкомаў, гарсаветаў, зямельных аддзелаў, Наркамзему, трактарацэнтраў, МТС, саўгасных і інш. трэстаў неадкладнай і рашучай перабудовы іх работы ў такім напрамку, каб забясьпечыць найбольшае павышэньне бальшавіцкай пільнасьці, рашучую ачыстку, асабліва нізавых зьвеньняў савецкага апарату ад клясава-чужых элемэнтаў, канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць у вырашэньні задач сельскай гаспадаркі і асабліва ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы і на справе ўмацаваньня сыстэматычнай работы правераным сельскім беспартыйным актывам, актывізуючы яго на штодзенны ўдзел ва ўсёй рабоце на вёсцы і ў рабоце сельсаветаў, калгасаў і інш. сельскіх арганізацый.

ЦВК і СНК у сваім кіраўніцтве гарсаветамі і РВК адначасова не павінны пры гэтым дапускаць абязьлічку раённых і сельскіх арганізацый, а наадварот, усямерна дапамагаць ім дабіцца правільнага і своечасовага ажыцьцяўленьня імі асноўных задач партыі на вёсцы.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК ухваляюць апошнюю пастанову ЦК УсеКП(б) аб узмацненьні работнікамі раёну і вёскі ў сувязі з выяўленым прарывам па кадрах пры правядзеньні загатовак і неабходнасьцю веснавую сяўбу сустрэць найбольш умацаванымі зьвеньнямі раёну і вёскі работнікамі.

Даручыць бюро ЦК вызначыць рад дадатковых мерапрыемстваў па далейшым умацаваньні раённых кадраў.

8. ЦВК і СНК павінны рашуча перабудаваць сваю работу з такім разьлікам, каб зараз-жа ўзмацніць апэрацыйнае кіраўніцтва работай саветаў, райвыканкомаў, усімі наркаматамі і гаспадарчымі арганізацыямі, дабіваючыся ад іх выразнай работы і сапраўды бальшавіцкай барацьбы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, у асаблівасьці ў галіне кіраўніцтва калгасамі і ўсёй сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі.

ЦК і ЦКК лічаць неабходным рашучае паляпшэньне пастаноўкі ўсёй справы праверкі выкананьня з тым, каб праверка выкананьня праводзілася не ў парадку вынясеньня рэзалюцый, а ў парадку штодзённага апэрацыйнага канкрэтнага кіраўніцтва, якое прасякнула-б непасрэдна ў самыя дробныя дэталі апэрацыйных задач па кіраўніцтве сельскай гаспадаркай. Праверка выкананьня павінна канцэнтравацца на важнейшых і рашаючых зьвеньнях работы і ў значна большай меры насіць характар жывой праверкі канкрэтных спраў моцнымі талковымі людзьмі.

ЦК і ЦКК асабліва падкрэсьліваюць неабходнасьць поўнага пераключэньня ўсіх сіл і работы органаў РСІ на штодзённы кантроль над работай гаспадарчых і савецкіх органаў, прыцягваючы да найстражэйшай адказнасьці, «ня гледзячы на асобы», работнікаў, якія не жадаюць перабудавацца і праяўляюць да даручанай справы чыноўніцка-бюракратычныя і безадказныя адносіны.

ЦК і ЦКК зварачаюць увагу ЦК ЛКСМБ і ўсёй камсамольскай арганізацыі БССР на тое, што камсамол абавязан зрабіць неабходныя вывады з выкрытых фактаў контр-рэвалюцыйнага шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы і забясьпечыць сапраўдную бальшавіцкую мабілізацыю ўсёй камсамольскай арганізацыі, кожнага камсамольца ў паасобку на барацьбу за канкрэтнае практычнае ажыцьцяўленьне баявых задач, пастаўленых партыяй, у асаблівасьці па сельскай гаспадарцы.

Пастановы студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), прамова тав. Сталіна па пытаньнях работы па вёсцы, указаньні тав. Сталіна аб рабоце камсамолу ў падрыхтоўцы і правядзеньні сяўбы, — павінны быць растлумачаны кожнаму камсамольцу і зьявіцца тэй падставай, на якой камсамольцы павінны па-бальшавіцку загартоўвацца і расьці, як непасрэдныя актыўныя будаўнікі сацыялізму.

ЦК і ЦКК ухваляюць пастанову ЦК ЛКСМБ аб пасылцы 600 камсамольцаў на пастаянную нізавую работу па калгасную вытворчасьць. Разам з тым бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК патрабуюць ад ЦК ЛКСМБ, ад усёй камсамольскай арганізацыі пасылку гэтых работнікаў праводзіць такім чынам, каб яны сапраўды былі актыўнымі работнікамі калгаснай вытворчасьці і арганізатарамі мас.

9. ЦК і ЦКК указваюць фракцыі ЦСПСБ, што факты выкрытага шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы ўказваюць на слабую работу і прафсаюзаў, асабліва ў тэй частцы, у якой яна зьвязана з сельскай гаспадаркай, і патрабуюць ад фракцыі ЦСПСБ неадкладна прыступіць да такой перабудовы ўсёй практычнай работы прафсаюзных арганізацый, якая-б забясьпечыла ўмацаваньне пралетарскага кіраўніцтва па вёсцы, асабліва з боку буйных пралетарскіх цэнтраў і прадпрыемстваў БССР (Менск, Гомель, Віцебск, Ворша, Магілеў і г. д.).

Перабудова павінна забясьпечыць, таксама як з боку партыйных арганізацый, па лініі прафсаюзаў жывое, а не папяровае кіраўніцтва, узмацненьне ўвагі і клопатаў у адносінах да кожнага вучастку работы прафсаюзаў на вёсцы. Прафсаюзныя арганізацыі павінны ні на хвіліну не забываць партыйнай дырэктывы аб тым, што без рашучай перабудовы работы прафсаюзных органаў, без арганізацыі штодзенных уважлівых адносін і клопатаў да патрэб рабочай клясы, без павышэньня працоўнай дысцыпліны, прадукцыйнасьці працы, рашучага павышэньня якасьці прадукцыі, без барацьбы з элемэнтамі рвацтва, ураўнілаўкі і дэзарганізатарамі вытворчасьці і г. д. — бяз усёй гэтай сумы мерапрыемстваў, якія выхоўваюць і ўмацоўваюць рабочую клясу Беларусі, надзвычай выраслую за апошні час за кошт прыліву з вёскі, з дробна-буржуазных праслоек гораду, мястэчак і г. д. — прафсаюзныя арганізацыі Беларусі ня будуць стаяць на вышыні патрабаваньняў і задач, пастаўленых партыяй у справе ўмацаваньня пралетарскай дыктатуры.

ЦК і ЦКК прызнаюць невыстарчальнай працу друку як рэспубліканскага, так і раённага па выкрыцьці буйнейшых недахопаў у рабоце савецкага і гаспадарчага апарату і партыйнай арганізацыі ў барацьбе супроць элемэнтаў групоўшчыны, сямейнасьці, безадказнасьці, славесна-дэкларацыйных і саноўна-панскіх адносін да справы.

ЦК і ЦКК патрабуюць ад друку сапраўднага разгортваньня, бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, у ажыцьцяўленьне на справе, а не на словах пастаноў партыі, сапраўднай бальшавіцкай перабудовы кожнай газэты ў барацьбе друку за важнейшыя гаспадарча-палітычныя работы партыі і асабліва па сяўбе і бальшавіцкім умацаваньні калгасаў і таксама дзейснасьці рабселькораўскіх карэспандэнцый і лістоў рабочых і сялян.

ЦК і ЦКК лічаць, што рашучай умовай ліквідацыі ў бліжэйшы час рэштак шкодніцтва, адставаньня партыйнай арганізацыі Беларусі ў выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных задач зьяўляецца: бязьлітасная барацьба з элемэнтамі, якія разлажыліся, гніласьцю, сямейнасьцю і са спробамі замазваньня вострых палітычных пытаньняў, на падставе рашучага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, канчатковая ліквідацыя рэштак групоўшчыны, месьніцтва і бальшавіцкая непрымірымасьць у барацьбе за ажыцьцяўленьне пастаўленых партыяй задач у гістарычнай для КП(б)Б пастанове ЦК УсеКП(б) аб сельска-гаспадарчых загатоўках у Беларусі, пастановах студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і прамове на ім тав. Сталіна.

ЦК і ЦКК прапануюць усім РК, РВК і кіраўніком савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый, сакратаром ячэек прапрацаваць гэту пастанову, узяўшы яе ў аснову сваёй практычнай працы і зрабіўшы адпаведныя канкрэтныя вывады для сапраўднай перабудовы ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі, якія прад'яўляюцца ў сучасны момант партыяй у кіраўніцтве ўсёй работай і асабліва сельскай гаспадаркай.

ЦК і ЦКК лічаць, што кожны сакратар РК, старшыня РВК, РКК, наркам, кіраўнік гаспадарчай установы, трэсту, заводу, МТС, саўгасу і калгасу абавязан зрабіць усе вывады з пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і ўказаньняў тав. Сталіна аб рабоце кожнага камуніста на яго ведамым вучастку яго працы, улічваючы пры гэтым, што ЦК, ЦКК КП(б)Б будуць са ўсёй бальшавіцкай жорсткасьцю і пасьлядоўнасьцю патрабаваць неадкладнага выкананьня і практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі на аснове гэтых пастаноў.

ЦК і ЦКК заклікаюць усю партыйную арганізацыю Беларусі адзінай бальшавіцкай шарэнгай, бязьлітасна змагаючыся з усякімі праяўленьнямі апартунізму, мабілізуючы партыйную арганізацыю на задушэньне малейшых спроб клясавага ворага сарваць мерапрыемствы партыі і ўраду — забясьпечыць выкананьне гістарычных задач, пастаўленых пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) і правадыром партыі тав. Сталіным.

НАПЯРЭДАДНІ ЗЬЛЁТАЎ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

ВОПЫТ ЗАВОДАЎ—КАЛГАСАМ

Ліст камуністаў рэчыцкага камбінату „Х Кастрычнік“, вылучаных на пастаянную работу ў вёску

У сваёй гістарычнай прамове «аб рабоце на вёсцы» тав. **СТАЛІН** надзвычай выразна ахарактарызаваў сутнасьць новай абстаноўкі, ва ўмовах якой адказнасьць камуністаў за разьвіцьцё нашай сельскай гаспадаркі павялічваецца ў шмат разоў. «Калгасы — сказаў тав. Сталін, — у сэнсе сваёй арганізацыйнай пабудовы ўсё яшчэ слабыя і маюць патрэбу ў сур'ёзнай дапамозе з боку партыі як у сэнсе забесьпячэньня іх выпрабаванымі бальшавіцкімі кадрамі, так і ў сэнсе бягучага кіраўніцтва калгаснымі справамі».

Гэта ацэнка калгасаў, як мы ведаем з практыкі работы па шэфстве, па гаспадарча - палітычных кампаніях, ня ў меншай, а нават у большай меры адносіцца да калгасаў нашага Рэчыцкага раёну.

Нашы калгасьнікі-ўдарнікі ў сваім лісьце на імя тав. **ГІКАЛО** выкрылі ўсе недахопы, якія заключаюцца ў тым, што «ў радзе калгасаў верхаводзяць справамі добра замаскаваныя антысавецкія элемэнты, арганізуючыя там шкодніцтва і сабатаж», што ў калгасах нізкая працоўная дысцыпліна.

Загатоўчая кампанія паказала слабую работу партыйных ячэек на вёсцы. Зразумела, што, не ўмацаваўшы работу партыйных ячэек на вёсцы, нельга справіцца з арганізацыйным гаспадарча-палітычным умацаваньнем калгасаў, а, значыцца, з пасьпяховым правядзеньнем веснавой сяўбы.

Вось чаму мы, рабочыя і камуністы фанэрна-запалкавага камбінату «Х Кастрычнік» у ліку 11 асоб, выказалі сваё жаданьне перайсьці на пастаянную работу ў вёску.

Свой вопыт партыйнай работы, вопыт сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, які мы набылі, перанясем на арганізацыю і ўздым калгаснай вытворчасьці.

Пераходзячы на пастаянную работу ў вёску, наша задача заключаецца ў тым, каб дапамагчы арганізаваць работу партыйнай ячэйкі, сельскага савету, камсамолу, арганізаваць вакол іх калгасны актыў, ахапіць масава-палітычнай работай кожнага калгасьніка, кожнага бедняка і серадняка — аднаасобніка, мабілізаваць на барацьбу супроць рэштак кулака і яго агентуры, на ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых партыяй.

Важнейшай задачай зараз зьяўляецца арганізацыя пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы першага году 2-ой пяцігодкі.

Увесь свой вопыт і сілы аддамо на выкананьне гэтай задачы, на поўнае ажыцьцяўленьне абавязкаў, якія на сябе ўзялі першы раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў у лісьце ЦК на імя тав. **ГІКАЛО. Мы ня будзем бальшавікамі, калі ня справімся з гэтай задачай.**

Пасылка ў калгасы 25 тысяч рабочых дапамагла разьвіцьцю і ўмацаваньню калгаснага руху. Новыя атрады перадавых рабочых-партыйцаў, пасланыя на пастаянную работу ў вёску, павінны зрабіць усё для таго, каб нашы калгасы былі бальшавіцкімі ў поўным сэнсе гэтага слова, з высокай прадукцыйнасьцю працы і вялікай таварнасьцю, зрабіць, як сказаў тав. Сталін, усіх калгасьнікаў заможнымі.

Фабрычныя і заводзкія арганізацыі не павінны абмяжоўвацца пасылкай дзесяткаў камуністаў і камсамольцаў на пастаянную работу ў вёску, а ў большай меры дапамагаць калгасам па лініі шэфства з поспехам правесьці веснавую сяўбу і ўмацаваць нашы калгасы арганізацыйна, гаспадарча і палітычна, ачышчаючы іх ад кулакоў і падкулачнікаў, гультаёў, жулікаў і раскрадальнікаў калгаснай маемасьці.

Будзем працаваць на ажыцьцяўленьне асноўных задач сельскай гаспадаркі так, як патрабуе гэтага наша партыя і лепшы вучань Леніна, наш правадыр і настаўнік тав. Сталін.

Маршкоў, Касьцючэнка, Мокін, Фідэль, Карнейчык.

Аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы у прыгарадных гаспадарках

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Заслухаўшы даклады дырэктароў прыгарадных гаспадарак фабрык і заводаў («Сьцяг індустрыялізацыі», шаўковай фабрыкі, Гомсельмашу, «Бярэзіны», Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, «Дняпро»—Рэчыца і г. д.) і судаклад камісіі ЦК і ЦКК, ЦК канстатуе выключна дрэннае становішча ходу падрыхтоўкі прыгарадных гаспадарак, што ставіць пад яўную пагрозу зрыву своечасовае і якаснае, у адпаведнасьці з дырэктывамі партыі, правядзеньне сяўбы.

Пад асаблівай пагрозай знаходзяцца наступныя віды работ па падрыхтоўцы гаспадарак да сяўбы: вывазка гною (22 проц.), ссыпка, ачыстка і праверка насенных фондаў, рамонт і падрыхтоўка парніковых рам (50 проц.), рамонт трактароў і с.-г. машын, падрыхтоўка конскай цяглавай сілы і камплектаваньне рабочай сілы.

2. ЦК лічыць, што ўсё гэта зьяўляецца вынікам:

а) бязьдзейнасьці большасьці дырэктароў каапгасаў, праяўленьня папушчэньня з боку заводакіраўніцтваў, партыйных, прафэсыянальных і каапэрацыйных арганізацый большасьці прадпрыемстваў, якія не забясьпечылі сапраўды бальшавіцкага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам падрыхтоўкі да сяўбы ў сваіх прыгарадных гаспадарках, займаліся пустой балбатнёй замест бальшавіцкай барацьбы за стварэньне ўласнай харчовай базы, за павышэньне ўраджайнасьці, павышэньне таварнасьці прыгарадных гаспадарак;

б) недапушчальна слабага кіраўніцтва Белкаапсаюзу пытаньнем падрыхтоўкі да сяўбы, а таксама няўважлівых паплявацельскіх адносін да гэтай важнейшай справы прамысловых наркаматаў і трэстаў;

в) зусім невыстарчальнай увагі з боку райкомаў і гаркомаў КП(б)Б, і асабліва гарсаветаў і гарпрафсаветаў, да пытаньня падрыхтоўкі сяўбы ў прыгарадных гаспадарках (большасьць гэтых арганізацый пытаньнем сяўбы амаль не займалася).

3. Лічачы такое становішча зусім нецярпімым, ЦК абавязвае, пад асабістую адказнасьць дырэктароў каапгасаў, трыкутнікаў прадпрыемстваў, с.-г. кіраўніцтва Белкаапсаюзу, старшынь гарсаветаў, кіраўнікоў прамысловых наркаматаў і трэстаў забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё наступных мерапрыемстваў:

а) поўнасьцю скончыць вывазку гною да 15 сакавіка;

б) да 10 сакавіка скончыць рамонт парніковых рам, прыняўшы неадкладныя меры да вышуканьня матар'ялаў для рамонту рам, матаў, у поўнай меры мабілізаваўшы ўнутраныя рэсурсы прадпрыемстваў;

в) дырэктаром каапгасаў, сельгаскіраўніцтву Белкаапсаюзу, пад адказнасьць т. Шлейфэра, забясьпечыць сканчэньне рамонту трактароў да 15 сакавіка, а таксама якасную прыёмку і выпрабаваньне трактароў. Заводакіраўніцтвам аказаць садзейнасьць у рамонце трактароў і сельска-гаспадарчых машын прыгарадных гаспадарак па прадпрыемствах;

г) дырэктаром каапгасаў неадкладна разгарнуць самазагатоўкі агародніх культур і забясьпечыць поўную ссыпку і ачыстку насенных фондаў да 5 сакавіка. Папярэдзіць іх, што сяўба ў 1933 г. павінна быць праведзена выключна ачышчаным, пратручаным і правераным на ўсхожасьць насеньнем. Белкаапплодагародніне, пад адказнасьць т. Зялічонка, выканаць заяўкі сельгаскіраўніцтва па загатоўцы насеньня гародніны, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на забесьпячэньне насеньнем ранняй бульбы, цыбулі і часнаку;

д) дырэктаром каапгасу сумесна з прафсаюзнымі арганізацыямі неадкладна арганізаваць пастаянныя вытворчыя брыгады ў каапгасах, рашуча ліквідаваўшы абязьлічку, павысіўшы працдысцыпліну і прадукцыйнасьць працы, праводзячы рашучую барацьбу з гультаямі, лятунамі і прагульшчыкамі. Да 10 сакавіка праверыць увесь склад агратэхнічнага пэрсаналу і рабочых каапгасаў, ачысьціўшы каапгасы ад варожых і шкодных элемэнтаў. Наркампрацы разгледзець заяўку БКС на ўкамплектаваньне прыгарадных гаспадарак агразаработнікамі, вылучыўшы з ліку мабілізуемых 10 чалавек;

е) гарсаветам да 15 сакавіка канчаткова ўстанавіць плошчы зямель прыгарадным гаспадаркам для пасеву збожжавых і кармовых культур у рамках адведзеных ім зямель, забясьпечыўшы да вызначанага тэрміну правядзеньне ўсіх землеўпарадчых работ у сувязі з увядзеньнем севазвароту. Сельгаскіраўніцтву Белкаапсаюзу даслаць да 10 сакавіка прыгарадным гаспадаркам тыповыя севазвароты;

ж) Белкаапсаюзу сумесна з прамысловымі наркаматамі на працягу 5-ці дзён разгледзець і зацьвердзіць пляны фінансаваньня гаспадарак на капіталаўкладаньні і зваротныя сродкі, забясьпечыўшы своечасовы спуск асыгнаваньняў.

4. Сельска-гаспадарчаму кіраўніцтву Белкаапсаюзу, Гарсаветам, гарпрафсаветам у дэкадны тэрмін праверыць выкананьне прыгараднымі гаспадаркамі пастановы СНК і ЦК УсеКП(б) пра падрыхтоўку конскай цяглавай сілы да пасеўнай кампаніі, прыняўшы адпаведныя меры, якія-б поўнасьцю забясьпечылі выкананьне гэтай пастановы. Камісіі выкананьня СНК праз дэкаду заслухаць даклады гарадоў—Менску, Віцебску і Гомелю аб выкананьні гэтага.

5. Улічваючы выключна слабую партыйна-масавую работу ў каапгасах, даручыць агітпрапу і агітмасу ЦК на працягу 5 дзён распрацаваць рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні ў каапгасах партыйна-масавай работы.

6. Абавязаць рэдактара газэты «Рабочы», а таксама рэдактароў гарадзкіх газэт забясьпечыць штодзеннае асьвятленьне ходу падрыхтоўкі прыгарадных гаспадарак да веснавой сяўбы, арганізуючы сумесна з ЦКК-РСІ і саўпрофам рэйды брыгад па праверцы фактычнага становішча ходу падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

7. Зацьвердзіць сьпіс упаўнаважаных ЦК і ЦСПСБ па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

8. Даручыць Віцебскаму гаркому КП(б)Б зьняць з пасады рэдактара прыгараднай гаспадаркі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» Воранава за выключна дрэнную працу і дапушчэньне момантаў безгаспадарчасьці, перадаўшы матар'ялы аб ім у райКК для прыцягненьня да партыйнай адказнасьці; адначасова прыцягнуць да партыйнай адказнасьці трыкутнікі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» і ЗРК, якія не забясьпечылі неабходнага кіраўніцтва гэтай прыгараднай гаспадаркай. Даручыць таксама Барысаўскаму РК КП(б)Б зьняць з працы Капалава, былога дырэктара Стара-Барысаўскай фэрмы, зараз дырэктара гаспадаркі фабрыкі «Бярэзіна», за дапушчэньне безгаспадарчасьці і злоўжываньняў, перадаўшы матар'ял аб ім у райКК для прыцягненьня да стражэйшай партыйнай адказнасьці.

ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу ГК, РК КП(б)Б і асабліва гарсаветаў, каапэрацыйных і прафарганізацый, трыкутнікаў прадпрыемстваў і дырэктароў каапгасаў, а таксама ўпаўнаважаных ЦК і ЦСПСБ на неабходнасьць самай рашучай бальшавіцкай барацьбы за баявое правядзеньне падрыхтоўкі і самой сяўбы, за абавязковае выкананьне дырэктыў партыі аб ураджайнасьці ў прыгарадных гаспадарках, і папярэджвае, што па выніках правядзеньня падрыхтоўкі і самой сяўбы ЦК будзе расцэньваць баяздольнасьць арганізацый і паасобных камуністаў і ўменьне іх змагацца за выкананьне важнейшых дырэктыў партыі пра стварэньне ўласнай харчовай базы і паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

„Апошнія“ процанты самацёкам не набягуць

Толькі два сельсаветы выканалі заданьні

ЛЕПЕЛЬ.

Усе тэрміны завяршэньня ільназагатоўчай кампаніі даўно прайшлі, а Лепельскі раён яшчэ мае вялікую запазычанасьць па здачы ільну. Плян выканан толькі на 88,7 проц. На 1-га сакавіка з 19 сельсаветаў раёну поўнасьцю рэалізавалі задачыні толькі 2 — **Зацеклякскі і Лепельскі.** На бліжэйшым да завяршэньня кампаніі **Лепельскі гарсавет, Сушанскі і Сьвяцкі** сельсаветы. Рэшта значна зацягвае ільназагатоўкі, прычым ёсьць і такія **(Прудокскі, Латыгалішкі, Замоскі),** якія ня выканалі нават і 80 проц. заданьня.

У раёне няма ўпартай барацьбы за ліквідацыю запазычанасьці перад дзяржавай. Махнулі рукой, пярашкі, што дацягнуць да 100 процантаў, моў, «ня ўдасца», а таму амаль зусім спынілі загатоўкі. Гэта-ж факт, што за апошнія дні прырост складае 0,1—0,2—0,3 проц. гадавога пляну. Больш таго, праходзяць дні, калі на пункты не паступае ні аднаго кілёграма ільну.

Між тым лён у раёне ёсьць, яго можна загатовіць пры жаданьні і ўменьні працаваць, пры мабілізацыі мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў на поўнае выкананьне пляну. Гэта з усёй выразнасьцю даказалі перадавыя калгасы і сельсаветы, якія, працуючы па-бальшавіцку, дабіліся перамогі. У калгасе **«Барэц волі»,** напрыклад, доўгі час заданьне зрывалася. Гэтаму спрыяла засьмечанасьць калгасу кулацкімі, антысавецкімі элемэнтамі. І толькі пасьля рашучага ачышчэньня калгасу ад гэтых элемэнтаў, пасьля канчатковага разгрому кулацкага сабатажу, **калгас выканаў заданьне нават з перавышэньнем.**

Прудокскі і Замоскі сельсаветы пастановай РК КП(б)Б і РВК занесены на чорную дошку. Ні пагрозы па гэта, кіраўнікі сельсаветаў і парт'ячэйкі як і раней бязьдзейнічаюць, зрываюць загатоўкі.

Патрэбны самыя рашучыя і неадкладныя меры. Злосны кулацкі сабатаж ільназагатовак павінен быць зломлен. Кіраўнікоў сельсаветаў, сакратароў парт'ячэек, нядобрых пабальшавіцку змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі, за пасьпяховае правядзеньне гаспадарча - палітычных кампаній, трэба замяніць іншымі, больш здольнымі работнікамі.

С. Г.

Новае кіраўніцтва ня лепшае за старое

ГАРАДОК. Вайханскі сельсавет знаходзіцца на чорнай дошцы за зрыў усіх відаў загатовак. Плян па ільне выканан толькі на 61,1 проц. Недадана дзяржаве 466 цэнтн. ільнавалакна. Плян загатовак ільнасемя выканан на 62 проц., бульбы — на 84 проц. Нават па збожжы ёсьць запазычанасьць у 1 цэнтн.

Кіраўніцтва сельсавету і парт'ячэйкі нядаўна было зьменена. Але і новае кіраўніцтва — старшыня сельсавету **Апанасенка**, сакратар ячэйкі **Зізікаў** — таксама не ўзялося за работу па-бальшавіцку, не дае адпору кулацтву і яго агентуры, якія арганізавалі ўпарты сабатаж загатовак.

Раённыя арганізацыі павінны неадкладна прыняць канкрэтныя меры, вывесьці Вайханскі сельсавет з глыбокага прарыву.

Мясцовы.

ЗВОДКА
аб ходзе ільназагатовак па ільнаводчых раёнах БССР на 4 сакавіка
(у процантах да гадавога пляну)

	РАЁН	Прырост за дзень 3 сакав.	Загатоўлена ад пачатку кампаніі
1.	Чавускі	—	104,0
2.	Крупскі	0,1	102,8
3.	Лёзьненскі	—	101,4
4.	Талачынскі	—	100,4
5	Чашніцкі	—	98,4
6.	Сураскі	0,2	98,3
7.	Бялыніцкі	—	95,5
8.	Дубровенскі	—	94,8
9.	Полацкі	0,2	93,5
10.	Шклоўскі	—	90,0
11.	Гарадоцкі	—	89,6
12.	Сеньненскі	0,1	89,3
13.	Лепельскі	0,3	89,0
14.	Горацкі	0,4	87,5
15.	Вушацкі	0,4	86,1
16.	Расонскі	0,1	84,9
17.	Бешанковіцкі	—	79,2
18.	Дрысенскі	—	78,1
19.	Асьвейскі	—	77,9
20.	Мсьціслаўскі	0,1	70,1
21.	Сіроцінскі	0,1	63,0
	Разам па ільнаводчых раёнах	**0,1**	**89,2**

УВАГА: Процант выкананьня пляну па Сеньненскім раёне выпраўлен, згодна апошняй праверанай тэлеграмы.

„Сьвяты айцец“ у ролі „актывіста“

ПОЛАЦАК.

Засьмечанасьць раду калгасаў чужымі, класава-варожымі элемэнтамі — вось адна з асноўных прычын слабага ходу ільназагатовак у Полацкім раёне.

У калгасе **«Кастрычнік»**, Гомельскага сельсавету, фармальна ўсё нібы «ў поўным парадку». Праўленьне засядае, ухвальвае прыгожыя рэзалюцыі, расьпінаецца ў адданасьці савецкай уладзе і г. д.

Але варта толькі прыглядзецца больш бліжэй да складу калгасу, каб убачыць, што тут далёка ня ўсё ў парадку. У калгасе знайшоў сабе прытулак былы дзяк з вёскі Турац — **Парчынскі** Пахом. Гэты «сьвяты айцец» ухітрыўся нават пры дапамозе паасобных членаў праўленьня пралезьці ў лік «актывістаў» калгасу. Зараз ён сыстэматычна раскрадвае калгаснае ільнавалакно і прадае яго на прыватным рынку. У сьвірне гэтага «калгасьніка» знайшлі значную колькасьць ільнавалакна. 14 кар. ільну ён пасьпеў прадаць нейкаму Парчынскаму Міхасю. Праўленьне калгасу ўсяго гэтага «ня бачыць». Што зьдзіўна, што калгас ня выканаў сваіх абавязацельстваў па здачы ільну дзяржаве?

У калгас **імя Фрунзэ**, Гарадоцкага сельсавету, пралез кулак **Сарока** Антон — былы кіраўнік панскага маёнтку, а потым буйны гандляр коньмі. Сарока ўвесь час вёў падрыўную работу ў калгасе, жадаючы разваліць яго з сярэдзіны. Гэта, аднак, не перашкодзіла праўленьню калгасу вылучыць Сароку... адказным за апрацоўку і здачу ільну дзяржаве. Тут кулак ва ўсю расьперазаўся. Ён направа і налева разбазарваў ільнавалакно. Вязучы лён на прыёмачны пункт, ён раскідваў яго па дарозе, каб менш здаць дзяржаве...

Старшыня калгасу **«Роўнасьць»**, Арлейскага сельсавету, Ксяндзоў упарта не жадае выканаць заданьня па здачы ільну. «Няма чаго здаваць» — крычыць ён, а на справе 16 пудоў ільну патаемна ён разьмяркаваў паміж калгасьнікамі.

Вось чаму раён, выканаўшы заданьне на 93,3 проц., на гэтым фактычна спыніў загатоўкі, замест таго, каб поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць перад дзяржавай.

М — н.

Да 50-годзьдзя са дня сьмерці Карла Маркса

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б з 10 сакавіка па 1 красавіка праводзіцца двухдэкаднік 50-годзьдзя з дня сьмерці Карла Маркса. На працягу двухдэкадніка па ўсёй сетцы партасьветы, школ і арганізацый будуць наладжаны спэцыяльныя заняткі, ранішнікі, даклады, гутаркі, прысьвечаныя рэвалюцыйнай тэорыі, жыцьцю і дзейнасьці Карла Маркса.

13 і 14 сакавіка адбудуцца адкрытыя сходы парт'ячэек. У дзень гадавіны 14 сакавіка урачыстае пасяджэньне Менгарсавету сумесна з партактывам г. Менску.

Па лініі ВНУ, ВТНУ, тэхнікумаў і навукова-дасьледчых установаў будзе праведзен агляд навуковай працы з тым, каб мабілізаваць масы на барацьбу са скажэньнямі марксызму-ленінізму. Вялікая работа намячаецца ў калгасах, саўгасах і МТС, дзе Марксавыя дні будуць увязаны з пытаньнямі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, рашэньнямі ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і з падрыхтоўкай да першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі.

Бібліятэкі, музэі, клюбы і інстытут гісторыі партыі арганізуюць выстаўкі, якія адлюструюць жыцьцё і дзейнасьць Карла Маркса.

Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б вылучыў групу навуковых работнікаў для прачытаньня дакладу аб К. Марксе ў раёнах БССР і на прадпрыемствах Менску. Арганізуецца выстаўка. Гадавіне будзе прысьвечан спэцыяльны нумар газэты «За ленінізм».

Беларускі дзяржаўны сацыяльна-гістарычны музэй у адзнаку 50-годзьдзя з дня сьмерці Карла Маркса арганізуе пры габінэце па гісторыі партыі спэцыяльны куток, прысьвечаны гадавіне, у якім рознымі матар'яламі і плякатамі будзе адлюстравана жыцьцё і дзейнасьць К. Маркса.

Адначасова музэем арганізуецца рад папулярных лекцый.

НАПЯРЭДАДНІ 8-га САКАВІКА
БССР—да дня работніцы

*** Прэзыдыум ЦВК БССР** адзначыў зусім недапушчальную недаацэнку падрыхтоўкі да сьвяткаваньня міжнароднага камуністычнага жаночага дня з боку цэнтральных савецкіх, гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый.

Большасьць устаноў абмяжавалася цыркулярамі без праверкі, як праходзіць падрыхтоўка па мясцох.

Прэзыдыум ЦВК абавязаў усе ўстановы і арганізацыі безадкладна разгарнуць работу, падагуліць вынікі падрыхтоўкі, каб па іх аснове намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове работы сярод працоўных жанчын.

* Жаночая брыгада ў складзе 25 чалавек з работніц і хатніх гаспадынь Аршанскага чыгуначнага вузла арганізавала **суботнік па ачыстцы вузла ад сьнегу.** Зароблены грошы ў адзнаку 8-га сакавіка перадаюцца ў фонд дапамогі сем'ям рэвалюцыянэраў, якія пакутуюць у капіталістычных турмах. Брыгада выклікала пасьледаваць яе прыкладу ўсіх **жанчын Аршанскага вузла і жонак чыгуначнікаў станцыі Менск і Барысаў** (БЕЛТА).

* На швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» у Менску арганізуюцца **дзьве гаспадарча-разрахунковыя брыгады жанчын імя 8-га сакавіка.**

*** У калгасах Віцебшчыны** ў часе веснавой сяўбы арганізуюцца **87 ясьляй.** Ужо пачалі працаваць курсы для падрыхтоўкі 45 кіраўнікоў дзіцячых ясьляй (БЕЛТА).

* 4-га сакавіка ў клюбе Камасьветы **(Менск)** адбыўся **зьлёт ударніц і гэроаў першай пяцігодкі,** прысьвечаны міжнароднаму жаночаму камуністычнаму дню. У зьлёце прынялі ўдзел каля тысячы жанчын.

У ганаровы прэзыдыум былі выбраны палітбюро ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, бюро Менгаркому партыі і прэзыдыумы гарпрафсавету і гарсавету.

З дакладам выступіў старшыня Менгарпрафсавету тав. **Шулькін.**

Ад імя рабочых і работніц, прыгнечаных польскай буржуазіяй, зьлёт вітала палітэмігрантка тав. **Шпарбэрг.**

Работніцы-ўдарніцы менскіх фабрык і заводаў у сваіх прамовах расказвалі аб тым, як яны змагаюцца за прамфінплян, за рэалізацыю дырэктыў партыі і ўраду.

Зьлёт паслаў прывітальныя тэлеграмы т. т. Сталіну, Крупскай, Клары Цэткін і Гікало.

Зьлёт прыняў адозву ад імя працоўных жанчын Менску да працоўных жанчын замежных краін.

Паведамленьне

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 9, 10 і 11 сакавіка ў гор. Рагачове будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разглядзе партсправаў наступных таварышоў:

На 9 сакавіка: Вінакураў Я. (Кармянскі раён).

На 10 сакавіка: Зайцаў А. Ц., Мухач А. В., Пузанаў А. І., Піваварэў С. З., Куляшоў П. Ц., Хрушчоў А. Р., Чыж І. М., Шапавалаў М. Д., Малахаў Ул., Нагерны М. К., Мазураў А. І., Князеў Я. (Быхаўскі р.).

На 11 сакавіка: Гавароўскі А. П., Смолкін Б. Г., Рабаў П. Л., Архіпенка С. І., Майзэльс І. Л., Гольдзін Г. С., Хацімскі Ф. І., Міткевіч А. І., Шандалаў Ф. В., Шыркоў А. Я., Хількевіч С. В., Макарчыкаў Я. Е., Карпаў С. Л., Лук'янцаў Д. Я., Куляшэўскі А. С., Сьвірдлін М., Бахавец Р., Каган Д. Е. (Рагачоўскі раён).

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Неабходна прадставіць ПТ ЦКК характарыстыкі ячэек аб апошняй рабоце.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

8-га сакавіка г. г., роўна ў 7 гадз. вечара,

у памяшканьні дому Камасьветы (былы клюб К. Маркса)

АДБУДЗЕЦЦА

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ

Менгаркому і ГКК КП(б)Б, Прэзыдыуму Менгарсавету і Гарпрафсавету,

прысьвечанае міжнароднаму камуністычнаму жаночаму дню.

ПАРАДАК ДНЯ:

Даклад аб міжнародным камуністычным дні.

Члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены ЦВК і СНК СССР і БССР, члены ГК і ГКК КП(б)Б, члены ЦК і ГК ЛКСМБ, члены Гарсавету, члены ЦСПСБ і ГСПС праходзяць на пасяджэньне па сваіх мандатах. Усе астатнія праходзяць па спэцыяльных запрашальных білетах, якія павінны атрымаць сакратары п-к не пазьней 7 сакавіка ў ГК КП(б)Б, пакой № 22.

Менгарком і ГКК КП(б)Б,
Прэзыдыум Менгарсавету і Гарпрафсавету.

ПАСТАНОВА
Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 28-II-33 г.
Аб правядзеньні міжнароднага жаночага камуністычнага дня „8-га сакавіка“

Сьвяткаваньне міжнароднага жаночага камуністычнага дня «8-га сакавіка» правесьці, як сьвята інтэрнацыянальнага значэньня, пад лёзунгам міжнароднай салідарнасьці працоўных, усебаковага азнаямленьня работніц і калгасьніц з умовамі працы і капіталістычнай эксплёатацыі работніц і сялянак за мяжой, пад знакам мабілізацыі працоўных жанчын на ажыцьцяўленьне задач першага году другой пяцігодкі, на выкананьне гістарычных пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), 3-й сэсіі ЦВК СССР і 4-й сэсіі ЦВК БССР.

Прэзыдыум Гарадзкога Савету **пастанаўляе:**

1. Склікаць 2-га сакавіка зьлёт жанчын дэпутатак Гарадзкога Савету і актыву з дакладам аб міжнародным жаночым камуністычным дні і нашых чарговых задачах. На гэтым зьлёце арганізаваць рэйд дэпутатак і актыву для праверкі становішча бытавых устаноў і практычнай дапамогі апошнім па паляпшэньні іх работы, а таксама арганізаваць брыгады і паслаць у сельсаветы для праверкі іх работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і аказаньня ў гэтым практычнай дапамогі.

2. Абавязаць сельсаветы, сэкцыі і дэпутацкія групы ў пэрыяд з 1-га сакавіка правесьці пленумы з удзелам жанчын-работніц і калгасьніц, а таксама сходы жанчын на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах з пастаноўкамі дакладаў аб міжнародным жаночым камуністычным дні і мерапрыемствах па ажыцьцяўленьні задач першага году другой пяцігодкі, завастрыўшы асаблівую ўвагу жанчын у ўдзеле на задачах веснавой сяўбы.

3. Абавязаць дэпутацкія групы на прадпрыемствах правесьці канкрэтную работу па ажыцьцяўленьні пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), сэсій ЦВК СССР і БССР на даным прадпрыемстве, у цэху. Асабліва завастрыць пытаньне аб ролі жанчын у вытворчасьці, на павышэньні іх кваліфікацыі і ўздыме прадукцыйнасьці працы.

4. Абавязаць сельсаветы арганізаваць брыгады жанчын членаў сельсаветаў і правесьці рэйд праверкі падрыхтоўчай работы саўгасаў і калгасаў да арганізацыі дзіцячых ясьляў і пляцовак у сувязі з веснавой пасеўнай кампаніяй.

5. Пабудаванаму ў Менску дзіцячаму гукавому кіно надаць імя «8-га сакавіка».

6. Прапанаваць Гарздраву і Гарана адкрыць не пазьней 1-га мая ў саўгасах і калгасах 102 дзіцячыя пляцоўкі-ясьлі, 44 сады, на што вызначыць 73.400 руб. па бюджэту Гарсавету і 30.000 руб. па лекавому фонду.

Прыцягнуць таксама да гэтай справы сродкі грамадзкіх арганізацый: «Чырвоны крыж» — 15.000 руб., «Прыхільнік дзяцей» — 20.000 руб.

7. Прапанаваць сельсаветам і калгасам (пад адказнасьць старшынь) і саўгасам (пад адказнасьць дырэктароў) зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу па адкрыцьці дзіцячых пляцовак, ясьляй і садоў, забясьпечыць іх адпаведнымі памяшканьнямі і абсталяваньнем, вызначыць фонды прадуктаў для харчаваньня дзяцей. Для арганізацыі і ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых мерапрыемстваў у кожным саўгасе і калгасе вылучыць адказных за гэту справу асоб.

8. Даручыць Гарснабу і Райспажыўсаюзу выдзяліць адпаведныя фонды вопраткі, абутку, пасуды і прадуктаў харчаваньня (цукар, мыла і г. д.) для снабжэньня садоў, ясьляў і пляцовак.

9. Гарана арганізаваць снабжэньне садоў, ясьляў і пляцовак цацкамі.

10. Даручыць Гарана правесьці кароткатэрміновыя курсы работнікаў, якія працавалі ў мінулым годзе ў дзіцячых садох, ясьлях і пляцоўках, для скарыстаньня іх на гэтай рабоце ў гэтым годзе.

11. Абавязаць Гарздраў забясьпечыць дзіцячыя сады, ясьлі і пляцоўкі мэдыцынскім абслугоўваньнем, прыманаваўшы для гэтага патрэбную колькасьць мэд. работнікаў.

Старшыня Менгарсавету **ВАЛОДЗЬКА.**
Сакратар Менгарсавету **ЯГОЎДЗІК.**

ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР БССР (БДТ I.)

АНОНС! Маст. кіраўн. Літвінаў

6 сакавіка ПРЭМ'ЕРА Л. П. Тур

ЗЯМЛЯ і НЕБА

п'еса ў 4-х дзеях.

Чырвоная зорка (са ад 1 г. дня) — Гукавы фільм вытв. Белдзяркіно **Першы ўзвод**

„Інтэрнацыянал“ (Каса—ад 12 г. дня) — Замежны мастацкі фільм **ТРЫ ДЖЫГІ**

ПРАЛЕТАРЫ. (Каса—ад 12 г. дня) — Амэрыканскі фільм **ЖАХІ ДЖУНГЛЯ** (ЧАНГ)

„СПАРТАК“ (Каса—ад 1 г. дня) — мастацкі фільм **САЛАМАНДРА** драма ў 7 частках.

Першы ў БССР дзіцячы гукавы кіно-тэатр.

Сёньня і штодзенна наступная праграма

1. **Парад глісараў** (гукавы фільм)
2. **Тэмпы рашаюць** (гукавы фільм)
3. **Заўжды гатовы** (нямы дз. фільм).

ПАЧАТАК 1-га сэансу ў 11 г. раніцы. КАСА АДКРЫТА з 10 гадз. раніцы.

Прымаюцца заяўкі на мэтавыя сэансы са скідкай 20 проц.

7 сакавіка, у 7 гадз. вечара,

у памяшканьні дзяржбанку (1-шы паверх)

склікаецца НАРАДА кліентуры дзяржбанку

па наступных пытаньнях:

1. **Аб новым парадку выдачы зарплаты, згодна пастановы ўраду**
2. **Аб рэалізацыі нялеквідаў і зьлішкаў тавара-матар'яльных каштоўнасьцяй.**

ЯЎКА АБАВЯЗКОВА

Белкантора Дзяржбанку.

ГарКК РСІ. Агульна-Выдавецкі Кантрольны пост пры Камітэце па справах друку СНК БССР і Менская Газэтна-Паштовая кантора

6-га САКАВІКА,

у 6 гадз. вечара, у клюбе Сувязі (Ленінская 34, двор 3-ці корпус)

СКЛІКАЮЦЬ

ПАШЫРАНУЮ АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ НАРАДУ

усіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, маючых непасрэдныя дачыненьне да падрыхтоўкі і правядзеньня пасеўкампаніі і зьвязаных з абслугоўваньнем органамі сувязі ў галіне перасылкі нэрыядычнага і неперыядычнага друку, пасеўных лістоў і прасоўваньня пасеўных пасылак.

Яўка запікаўленых у гэтым пытаньні і выкліканых асобнымі позвамі абавязкова.

ГарКК РСІ
Кантрольны пост
Менская газэтна-паштовая кантора

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА
Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

17 лютага 1933 г. № 1. гор. Менск.

Правілы вулічнага руху па гораду Менску

Працяг разьдзелу II

Мэханічны транспарт

29. Да кіраваньня мэханічным транспартам дапускаюцца асобы:
а) маючыя права на кіраваньне;
б) атрымаўшыя адпаведную візу ў органах РС міліцыі;
в) ва ўзросьце не маладзей 18 год, а да кіраваньня транспартам грамадзкага значэньня (трамвай, аўтобус)—не маладзей 20 год.

30 Рух па гораду дазваляецца выключна экіпажам, атгледжаным тэхнічнай камісіяй і прызнаным годным да эксплёатацыі. Тэрміны тэхнічнага агляду ўстанаўліваюцца і абвяшчаюцца ў газэтах.

31. Не дапускаецца да руху па гораду мэханічны транспарт:
а) з няспраўнымі тармазамі;
б) з люфтам больш 1/10 зваароту руля;
в) без глушыцеля, з адкрытым глушыцелем і дымам пры руху;
г) з цечу радыятара;
д) з люфтам у колах;
е) без крыльляў;
ж) з кузавам, афарбаваным у чырвоны колер, за выключэньнем машын пажарных і хуткай мэдычнай дапамогі і трамваю;
з) з мэталічнымі выступамі на восьсях колаў;
і) прывадзімы ў рух прапэлерам;
к) без нумарных знакаў;
л) без пярэдніх і задніх ліхтароў;
м) без сыгнальных прыстасаваньняў;
н) пры адсутнасьці двух незалежных тармазоў;
о) з апушчанымі і лопнуўшымі шынамі;
п) без кузава, або з забруджаным кузавам;
р) аўтамабілі, якія маюць 4 тармазы, і без спэцыяльнага знаку ў выглядзе роўнабедранага трыкутніка і сыгналу «Стой»;
с) пры адсутнасьці тармазоў.

32. Кожны вадзіцель мэханічнага транспарту перад выездам на працу павінен быць забясьпечан пуцявым аркушам, які падпісваецца, апрача нарад чыкаў, абавязкова той асобай, якая адказвае за тэхнічную спраўнасьць транспарту.

33. Кожны экіпаж мэханічнага транспарту павінен быць забясьпечан сыгнальнымі прыстасаваньнямі для падачы выразных і гасосных звукавых сыгналаў.

Забараняецца карыстаньне сыгналамі, прысвоенымі аўтамабілям міліцэйскім, хуткай дапамогі мэдычнай і тэхнічнай, а таксама пажарных каманд.

34. У выпадку пашкоджаньня ў дарозе асьвятляльных прылад, вадзіцель мэханічнага транспарту абавязан прыняць меры да іх папраўленьня.

Пры немагчымасьці паправіць іх, ён абавязан неадкладна вярнуцца ў гараж, рухаючыся з хуткасьцю ня звыш 15 клм. у гадзіну.

35. Усе аўтобусы і грузамашыны павінны быць забясьпечаны добра дзейнічаючымі адлюстральнымі прыладамі (люстэркамі).

36. Практыкаваньне (вучэньне) езьдзіць на экіпажах мэханічнага транспарту па гораду дазваляецца пры кіраўніцтве і прысутнасьці інструктара, які мае спэцыяльнае пасьведчаньне з адзнакай аб рэгістрацыі ў кіраўніцтве РС міліцыі.

37. Вучэбная машына абавязкова павінна быць забясьпечана дадатковымі педалямі (сцэпленьня тармазы).

У выпадку аварый і парушэньняў правіл вулічнага руху адказнасьць нясе інструктар.

38. Пры сустрэчных разьездах вадзіцелі аўтамабіляў павінны пераключаць сьвятло на ліхтарах з белым сьвятлом (падфаркі) ці выключаць зусім, дабіўшы папярэдні сыгнал.

39. Пробныя іспыт аўтамабіляў і матацыклаў, ня маючых рэгістрацыйных бляшанак, можа рабіцца толькі пры наяўнасьці асобных бляшанак, выдаваемых Гаспадарчансам на тэрмін ня звыш трох дзён.

40. Бляшанкі для пробнага іспыту павінны прымацоўвацца на тых-жа мясцох, як рэгістрацыйныя.

41. Забараняецца рабіць пробныя іспыты на вуліцах. Іспыты дазваляюцца толькі за лініяй гораду і на маталюдных вуліцах.

Легкавыя машыны

42. Хуткасьць не павінна перавышаць агульнай хуткасьці—30 клм. у гадз., а з наступленьнем цемры—20 клм.

Максымальная хуткасьць аўтобуса ўстанаўліваецца ня звыш 25 клм. у гадз., а з наступленьнем цямна ня звыш 20 клм. у гадзіну.

На перакрыжаваньнях і паваротах хуткасьць устанаўліваецца згодна ўстаноўленых знакаў.

Вадзіцелі машын павінны захоўваць паказаную максымальна-агульную хуткасьць на шляхох як пры ўезьдзе, так і пры выезьдзе з гор. Менску, на адлегласьці 10 клм., лічачы гэту адлегласьць ад канечнай вуліцы, прылягаючай да шляху.

43. Легкавы аўтамабіль павінен быць забясьпечан двума нумарнымі знакамі, прымацаванымі сьпераду пад радыятарам і ззаду на кузаве, або асобным кранштэйне, ня ніжэй 0,5 мэтра ад зямлі.

Нумарныя знакі павінны быць заўсёды ў спраўнасьці і не забруджаны.

44. Чужаземныя аўтамабілі, прыбыўшыя на тэрыторыю БССР, у парадку правіл, прынятых на міжнароднай аўтамабільнай канфэрэнцыі 1926 г., захоўваюць знакі, прынятыя ў іх краінах, і апрача іх павінны мець спэцыяльны адрозьніваючы знак устаноўленай для кожнай дзяржавы формы.

45. З наступленьнем змроку, а таксама пры густым тумане, легкавы аўтамабіль павінен мець 2 запаленыя ліхтары са сьвятлом ня звыш 21 сьвечкі, з бясколерным шклом і ззаду зьлева камбінаваны ліхтар, добра асьвятляючы нумарны знак і адбіваючы назад чырвонае сьвятло.

46. Унутры закрытыя кузавы таксі павінны абавязкова асьвятляцца з наступленьнем змроку.

47. Забараняецца ўжываньне асьляпляючага сьвятла ў лініі гораду, а таксама ўжываньне фар з дальнім сьвятлом.

48. Задні ліхтар павінен асьвятляць нумарную бляшанку такім чынам, каб усе лічбы і знакі былі ясна відаць, і апрача таго павінен мець папярэджваючае чырвонае сьвятло.

49. Забараняецца вадзіцелям легкавых аўтамабіляў спыняць машыны без нагляду:
а) на ўсхілах;
б) у мясцох, дзе рух сьцясьнён.

Пакінутая на вуліцы машына павінна быць затарможана ручным тормазам, матор павінен быць выключан.

Матацыклеты

50. Максымальная хуткасьць для матацыклетаў устанаўліваецца тая-ж, што і для легкавых аўтамабіляў (п. 42)—30 клм.

51. На матацыклеце адна бляшанка прымацоўваецца на прэбні папярэдняга шчытка, а пры адсутнасьці апошняга—іншым спосабам, у вэртыкальным палажэньні, лічбамі па баках руху; другая ззаду, на канцы задняга шчытка, лічбамі ў бок, адваротны руху.

52. Матацыкль павінен быць забясьпечан пярэднім і заднім ліхтарамі, якія запальваюцца з наступленьнем цямна і пры густым тумане.

Сіла сьвятла тая-ж самая, што і для легкавых аўтамабіляў (п. 45).

53. Матацыклям з каляскаю дазваляецца праезд па рэйках трамваю, выключаючы стрэлкі.

Грузавыя аўтамабілі

54. Грузавы аўтамабіль павінен мець:
а) два нумарныя знакі, прымацаваныя сьпераду пад радыятарам і ззаду на асобным кранштэйне пад кузавам, ня ніжэй 0,5 мтр. ад зямлі;
б) з наступленьнем цямна і пры густым тумане асьвятленьне парадкам, паказаным у п. 45.

55. Забараняецца язда па трамвайных рэйках; выключэньне дапускаецца для вузкіх вуліц, дзе язда па трамвайных рэйках толькі дазваляецца левым колам.

56. Пры неабходнасьці грузавому аўтамабілю пад'ехаць да дому, разьмешчанага па вуліцы, у якой грузавы рух забаронен, выезд робіцца з бліжэйшай вуліцы або завулку.

57. Вышыня нагрузкі для грузавых аўтамабіляў дапускаецца ня звыш 4 мтр., лічачы ад паверхні бруку. Найбольшая даўжыня зьвешваючайся часткі нагрузкі, па даўжыні аўтамабілю, не павінна перавышаць 2 мтр. і не павінна датыкацца бруку. Найбольшая шырыня нагрузкі дапускаецца ня звыш 2,5 мтр.

58. Нагрузка і разгрузка на вуліцах з інтэнсыўным рухам забараняецца і робіцца выключна ў дварох, або прылягаючых завулках.

59. Пры руху па гораду цягачоў, трактароў і грузавых аўтамабіляў з прычэпам, кожны прычэп павінен мець тармазы, якія забясьпечваюць астаноўку іх на самых вялікіх усхілах.

Прычэп павінен мець самастойны нумарны знак і нумар цягача.

60. Нагрузка прычэпу не павінна перавышаць грузапад'ёмнасьці цягача або грузавіка.

Аўтобусы

61. Пад'яжджаючы да астановак для пасадкі і высадкі пасажыраў, аўтобусы абавязаны спыняцца непасрэдна ля тратуара, або ў асобна ўстаноўленых мясцох у адзін рад. З месца астаноўкі машына можа крануцца толькі па скончаньні высадкі і пасадкі пасажыраў.

62. Аўтобусы абавязаны спыняцца на ўсіх сваіх астаноўках. Маршруты аўтобусаў, а таксама і месца астановак узгадняюцца з адпаведнымі кіраўніцтвамі РС міліцыі.

Разьдзел III
Гужавы (конны) транспарт

63. Да кіраваньня коннымі экіпажамі дапускаюцца асобы, якія маюць права на язду, і не маладзей 18 год.

64. **Забараняецца:**
а) язда на конях і іншай вупражнай жывёле, неабезьджанай, хворай і незакілзанай, неакаванай і неачышчанай.
б) язда па пуцях трамваю, за выключэньнем выпадкаў, калі інакш няма магчымасьці праехаць;
в) пераезд праз трамвайную лінію з прычыны набліжэньня вагонатрамваю, калі апошні на адлегласьці, не дазваляючай пераехаць своечасова;
г) язда на санях без падрэзаў, перашкаджаючых раскату;
д) пакіданьне коняў і іншай вупражнай жывёлы без нагляду;
е) прывязваньне коняў да дрэў, ліхтароў, кратаў і г. д.;
ж) стаянка не на мясцох, устаноўленых органамі РС міліцыі;
з) кармёжка на вуліцах вупражнай жывёлы без торбаў.

Грузавыя конныя экіпажы

65. Грузавыя конныя экіпажы павінны мець нумарны знак, прымацаваны з левага боку дугі, на відным месцы, які павінен быць заўсёды ў спраўнасьці і не забруджаным.

Замазваньне нумарных знакаў аркамі і паводзьдзямі не дапушчаецца.

66. Ламавыя возчыкі абавязаны:
а) мець афарбаваную дугу, на якой з ліцавой стараны павінна быць напісана назва ўстановы або прозьвішча ўласьніка.

Пры вупражцы без дугі такія надпісы павінны быць зроблены на асобнай мэталёвай дошцы, якая прымацоўваецца з левага ванкавага боку павозкі;
б) мець бляшанку (нумарны знак), прыбітую да дугі з левага боку ззаду, а пры запражцы без дугі—на экіпажы з левага боку;
в) пры язьдзе трымацца бліжэй да тратуара ў адзін рад, пакідаючы вольна ад сябе праезд для абгону;
г) ехаць шагам, як з грузам, таксама і парожнякам.

67. Прывязваньне ззаду ілучай вупражнай жывёлы да пярэдніх фурманак забараняецца.

Пры хадзьбе возчык павінен ісьці з правага боку. Ісьці па тратуары возчыку забараняецца.

68. Пры кожнай грузавой коннай павозцы павінен знаходзіцца возчык, які абавязан трымаць лейцы ў руках, або весьці жывёлу пад уздзу.

69. Язда па вуліцах робіцца выключна шагам і ў адзін рад. Пры сьледаваньні абозам паміж падводамі павінен быць інтэрвал у 1 мтр., праз кожныя 3 падводы павінен быць інтэрвал для вольнага праходу; такія-ж інтэрвалы павінны быць і пры астаноўцы абозу.

70. Нагрузка кожнай падводы павінна адпавядаць сіле жывёлы і становішчу дарогі. У выпадку, калі жывёла ня будзе ў стане весьці груз, возчык абавязан прыняць меры да аблягчэньня падводы.

71. Забараняецца ўжываньне для падгону жывёлы мучыцельных і калечачых прадметаў і наогул жорсткае абыходжаньне з ёю.

72. Перавозка грамоздкіх матар'ялаў, як-та: рэек, бэлек, бярвеньняў і дашок павінна рабіцца на роспусках, або на санях з падсанкамі. Груз павінен быць уложан і ўвязан так, каб не выдаваўся па баках, не цягнуўся па бруку, не ствараў пры перавозцы шуму і грукату і не перавышаў 3-х мэтраў у вышыню.

73. Пры спуску з гары і ў іншых неабходных выпадках, павозкі павінны тармазіцца. Язда без лейц на кані забараняецца.

74. Забараняецца з 10 гадзін і да 21 гадз. транзітны праезд грузавым конным экіпажам па вуліцах:
1) Савецкай—ад Валадарскага да Чырвонаармейскай,
2) Ленінскай—ад пляцу Волі да Савецкай,
3) Энгельса—ад пляцу Волі да Савецкай,
4) Карла Маркса,
5) Нова-Бабруйскай.

75. Для стаянкі грузавых конных экіпажаў устанаўліваюцца наступныя месцы:
1) на рагу Нямігскай і Няміга-Ракаўскай,
2) » Камунальнай і Семінарскага завулку,
3) » вуліц Талстога і Маскоўскай,
4) каля Койданаўскага шляху,
5) на пляцу каля 3-й Савецкай лазьні.

76. Устанаўліваюцца наступныя маршруты для грузавога транспарту:

А. ГРУЗАВЫ РУХ З ТАВАРНАЙ МББ ЧЫГ. — ЭЛЬВОД, «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК».

Койданаўскі тракт, Маскоўская, Мяснікова, Няміга, Калінкоўская, Гандлёвая, Кастрычніцкая, Садовая і на Савецкую.

Б. РАЁН БАЛОТНАЙ СТАНЦЫІ.

З Гандлёвай на Шырокую, Мошраўскую, Камунальную на Старажоўскі тракт. На Пярэспу: Камунальная, Старажоўка, Далгінаўскі тракт.

В. З ТАВАРНАЙ У РАЁН ЛЯХАЎКІ.

Маскоўская, Бабруйская, Ленінградская, Землеробская, Сьвярдлоўская, Круглы завулак, 2-гі Ляхаўскі мост і вул. Варашылава.

Г. РАЁН ЛЯХАЎКА—КАМАРОЎКА.

Чырвонаармейская да Першамайскай, Першамайская, Шпітальная і Савецкая.

Д. ЛЯХАЎКА—ПЯРЭСПА.

Чырвонаармейская, Першамайская, Пралетарская, Набярэжная, Пралетарская, Шырокая, Старажоўская—Пярэспа.

Е. ПАСАЖЫРСКІ ВАКЗАЛ.

У раён Ляхаўкі: Ульянаўская, Сьвярдлоўская, Універсытэцкая, Чырвонаармейская, Першамайская.

Легкавыя конныя экіпажы

77. Вупраж і экіпаж павінны заўсёды быць у спраўнасьці.

78. Экіпаж павінен быць забясьпечан фартухом, а сані полсьцю. Легкавыя экіпажы павінны мець два нумарныя знакі, прымацаваныя: адзін зьлева на сядзеньні вадзіцеля і другі ззаду на кузаве. Нумарныя знакі павінны быць у спраўнасьці і ў незабруджаным выглядзе.

79. Легкавыя фурманы абавязаны мець чыстую адзежу.

80. Вадзіцелям легкавых конных экіпажаў у час руху забараняецца злазіць на мясцох седакоў.

81. Для легкавых возчыкаў устанаўліваюцца месцы стаянак:
1) на рагу Камсамольскай і Рэвалюцыйнай,
2) » Рэвалюцыйнай і Рэспубліканскай,
3) » Савецкай і Вайсковай,
4) » Камунальнай і Камунальнага завулку,
5) » Камунальнай і Старажоўскай,
6) » Сьвярдлоўскай і Ленінградскай,
7) » Рэспубліканскай і 25 Кастрычніка,
8) » Савецкай і Сьвярдлоўскай,
9) » Ленінскай і Універсытэцкай,
10) Каля станцыі Менск-Таварная,
11) каля станцыі Менск-Пасажырская,
12) Кастрычніцкая, каля скверу.

82. Забараняецца прымаць седакоў у колькасьці, перавышаючай 3-х асоб, а таксама вазіць груз, выходзячы за межы экіпажу.

(Працяг. Канец у наступным нумары).

Менск, друкарня газэты «Зьвязда». Галоўлітбел № 337.